Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

17 КРАСАВІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 71 (27681) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Выжыць у вогненнай вёсцы

СТАР. 6

Сямейная газета

Усынаўленне: два бакі медаля

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Задача ўрада і Нацыянальнага банка — зняць усе абмежаванні па крэдытаванні малога і сярэдняга бізнесу ў краіне. Думаю, нам удасца гэта зрабіць у бліжэйшы час. Самае галоўнае — гэта работа на месцах. Большасць пытанняў вырашаюцца на ўзроўні абласцей і раёнаў. Усе звароты малога і сярэдняга бізнесу павінны разглядацца па прынцыпе аднаго акна. Прычым рабіць гэта трэба неадкладна, без усялякіх затрымак і з максімальнай фінансавай і адміністрацыйнай падтрымкай. Зараз доля малога і сярэдняга бізнесу займае 25% у ВУП Беларусі. У 2015 годзе яго доля павінна дасягнуць 30%, а да 2020-га — не менш як 50%. Калі мы выйдзем на ўзровень больш за 50% малога і сярэдняга бізнесу ў ВУП, то работа нашай эканомікі ў цэлым будзе параўнальная з перадавымі краінамі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.04.2014 г.

Долар ЗША	9940,00	■
Еўра	13750,00	▲
Рас. руб.	275,50	▼
Укр. грыўня	871,93	▲

ISSN 1990 - 763X

«ЗАЛАТЫЯ» ПІСКЛЯНЯТЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Быхаўская птушкафабрыка «Агралінк» спецыялізуецца на вытворчасці інкубацыйных яек і сутачных куранят мясных пародаў, уваходзіць у лік прадпрыемстваў-лідараў у Беларусі. Шмат гадоў працуе на птушкафабрыцы Ганна Чахленка *(на фотаздымку)*. Ёй даверaны догляд больш як дзесяці тысяч куранят.

АДСТУПАЦЬ АД МЭТ НЕ БУДЗЕМ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвярджае пазіцыю беларускага боку аб неабходнасці ліквідацыі ўсіх выключэнняў і абмежаванняў у будучым Еўразійскім эканамічным саюзе.

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча. Падчас дакладу Прэзідэнт пацікавіўся вынікамі сустрэчы кіраўнікоў урадаў «тройкі» ў Маскве, якая праходзіла 15 красавіка. «Гэта вельмі важна напярэдадні сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў у Мінску 29 красавіка. Гэта павінна быць этапная, фундаментальная сустрэча, паколькі пасля ўжо не застаецца часу на дапрацоўку і падпісанне фактычна дагавора аб эканамічным саюзе», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, як партнёры, і перш за ўсё Расійская Федэрацыя, успрымаюць прапановы беларускага боку. «А яны (*прапановы*. — **БЕЛТА**) абсалютна нармальныя. Калі мы будуем саюз і імкнёмся да таго, каб тут не было ніякіх межаў, значыць, не павінна быць ніякіх выключэнняў і абмежаванняў у перамяшчэнні тавараў, рабочай сілы, капіталу. Гэта асноўная мэта. Таму мы з гэтага зыходзім, — сказаў Прэзідэнт. — Шмат на гэты конт, вядома, спекуляцый, нібыта мы ставім сабе свае мэты і г.д. Як быццам мы павінны праследаваць мэты Еўрасаюза ці ЗША...».

«Кожны мае свае мэты, але мы цалкам згодны з тымі мэтамі, якія дэкларavаны, і адыходзіць ад гэтага ні ў якім выпадку не маем намеру. Мы таксама шмат што страчваем. У параўнанні з Расіяй мы невялікая краіна і разумеем, чаго гэта нам можа каштаваць. Але, тым не менш, калі вырашылі, мы ў гэтым кірунку дзейнічаем», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падчас рабочай сустрэчы даў шэраг даручэнняў па эканамічных пытаннях, звязаных з інвестыцыйнай праграмай, рэалізацыяй асобных праектаў. Ён паставіў задачу актывізаваць работу па праблемных прадпрыемствах у лёгкай прамысловасці, іншых аб'яднаннях і гаспадарчых таварыствах, за якія адказвае ўрад.

■ Камандзіроўка па пісьму

«АФРЫКАНСКІЯ» СТРАСЦІ

Прафілактыка супраць чумы свіней закранула інтарэсы вяскоўцаў Мсціслаўскага раёна

Нагодай для камандзіроўкі ў гэты раён стаў зварот жыхароў аграгарадкоў Сялец і Падлужжа. Абуральныя парушэнні, пра якія паведамляў невядомы адрасант, існавалі, па яго словах, на адной са свінагадоўчых фермаў раёна. І гэта ў той час, калі ўсе навокал заклапочаны недапушчэннем распаўсюджвання афрыканскай чумы па свеце.

Факты і каментарыі

Пад прыцэл аўтара скаргі трапілі 2 мсціслаўскія гаспадаркі — «СожАгра» і імя Чапаева. І больш за ўсё дасталася першай, дзе знаходзіцца невялікая свінаферма. Паведамлялася, што там адсутнічае біялагічная абарона, няма санпрапускнікоў, транспарт бесперашкодна заязджае і выязджае на тэрыторыю. А на малочнатаварнай ферме СВК імя Чапаева — бруд і антысанітарыя.

СТАР. 4

■ Клопат пра галоўнае

ВУЧНІ — ПАД ПІЛЬНЫМ ВІДЭАВОКАМ

Цяпер, каб трапіць на ўрокі ў школу № 72 Гомеля, вучні прыкладаюць да турнікета імянную электронную картку. Усё падарасламу — як ва ўстановах, дзе ўваход для старонніх асоб забаронены. Сістэма відэаназірання, устаноўленая на грошы шэфаў з ТАА «Гарант», працуе пакуль у тэставым рэжыме. Але і за кароткі тэрмін дакладна высветлілася, што менш стала прагулаў і спазненняў.

Дзеці ёсць дзеці. Ім цікава, як дзейнічае новая апаратура, і таму некаторыя часам спрабуюць падмануць яе: пралезці пад турнікетам, калі забылі картку дома. Абсалютную большасць не здзівілі меры бяспекі ў школе. І не толькі таму, што па тэлевізары расказваюць аб розных пагрозах. Агульная камп'ютарызацыя — гэта, хутчэй, норма. Кіраўніцтва ўстановы гаворыць, што пакуль усталяваны толькі тры камеры відэаназірання, але паступова кантроль стане практычна агульным. Бацькі могуць замовіць у прадпрыемстве, якое абслугоўвае навучальную ўстанову, і дадатковую паслугу — СМС-паведамленне, якое аўтаматычна прыходзіць, як толькі іх дзіця пераступае ганак школы, а дакладней, прайшло праз турнікет навучальнай установы. Інфармацыя пра тых, хто на заняткі не з'явіўся, паступае да завуча, які тэлефануе пры неабходнасці бацькам, каб высветліць прычыну адсутнасці канкрэтнага вучня. Заяўка на харчаванне таксама робіцца па вынiках наяўнасці-адсутнасці вучняў у школе. А значыць, не трэба, як раней, бегаць па класах і збіраць гэтую інфармацыю.

СТАР. 3

НАПРАЦАВАНЫ ВОПЫТ І НОВАЯ АТМАСФЕРА

Беларусь прапаноўвае Ірану аднавіць ранейшы высокі ўзровень узаемадзеяння, у тым ліку гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага.

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй сходу ісламскага савета Ісламскай Рэспублікі Іран Алі Ларыджані.

«Іран мы заўсёды разглядалі як перспектыўнага партнёра для супрацоўніцтва. Больш за тое, у нас былі і ёсць вельмі цесныя сяброўскія адносіны», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён дадаў, што Беларусь і Іран дасягнулі пэўных вынікаў у эканамічнай сферы, ва ўзаемным тавараабароце.

Разам з тым, Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на зніжэнні ўзроўню кантактаў, паведамляе БЕЛТА. Ён лічыць, што ёсць аснова для выхаду ўзаемадзеяння на самы высокі ўзровень з улікам існуючага вялікага вопыту двухбаковага супрацоўніцтва. «Лічу, што няма неабходнасці гаварыць пра нашы магчымасці, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Вы добра ведаеце Беларусь, мы — Іран. Магчымасці і ў нас, і ў вас каласальныя».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена ў іранскіх інвестыцыях. «Хацелася б, каб тут было больш руху, каб вы ў цэнтры Еўропы дэманстравалі ўсім, што Іран ёсць, ён не проста жывы, ён будзе доўга жыць і на злосць нашым ворагам будзе квітнець». Акцэнтуючы ўвагу на важнасці беларуска-іранскіх праектаў, якія ажыццяўляюцца ў Беларусі, у тым ліку інвестыцыйных, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта выгадныя праекты, і яны акупяцца».

НЕ ГОРШ, ЧЫМ У АТЭЛЯХ

Федэрацыя прафсаюзаў гатова размясціць каля 1 тысячы гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі на базах вакол Мінска. Аб гэтым Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня ФПБ Леанід КОЗІК.

Леанід Козік паведаміў, што ФПБ выканала даручэнне Прэзідэнта і падрыхтавала свае базы ў наваколлі Мінска для прыняцця гасцей чэмпіянату. Тут змогуць размясціцца каля 1 тысячы чалавек. Па словах старшыні Федэрацыі прафсаюзаў, гэтыя аб'екты па наборы паслуг, якія прадастаўляюцца, практычна нічым не адрозніваюцца ад сучасных гасцініц. Госці і ўдзельнікі ЧС, якія будуць пражываць у санаторыях, змогуць пры жаданні атрымаць дадатковае лячэнне, як і іншыя пастаяльцы.

Прэзідэнт падзякаваў прафсаюзам «за спакойную, ціхую, ненавязлівую работу па арганізацыі выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў», а таксама папрасіў далажыць аб сітуацыі ў прафсаюзным руху, праблемных пытаннях, на якія неабходна звярнуць увагу. Старшыня ФПБ адзначыў, што сітуацыя ў цэлым нармальная. У краіне працуюць 23 тысячы прафсаюзных арганізацый, якія ведаюць настрой людзей, іх праблемы і пажаданні.

Размова таксама ішла аб санаторна-курортным лячэнні, дзіцячым аздараўленні. Як далажыў Леанід Козік, у санаторыях каля паловы адпачывальнікаў — гэта замежныя грамадзяне, перш за ўсё з Расійскай Федэрацыі, якія задаволены як умовамі, так і медыцынскім абслугоўваннем. Паводле яго слоў, беларускія санаторыі загружаны на 100% круглы год. Што тычыцца дзіцячага аздараўлення, то плануецца, што сёлета ў дзіцячых лагерах адпачнуць 345 тысяч дзяцей. Кошт пуцёўкі для бацькоў не перавысіць 10% ад яе агульнага кошту. ФПБ выдзеліла сродкі для кожнай вобласці, якія будуць накіраваны на патанненне пуцёвак для дзяцей са шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, паведамляе БЕЛТА.

■ Лепшыя з лепшых

ПАВЕЛІЧЭННЕ ЭКСПАРТУ ЗА КОШТ ЯКАСЦІ

Узнагароджаны пераможцы конкурсу на суісканне Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці 2013 года

Фота БЕЛТА.

Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на суісканне Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці. За 15 гадоў лаўрэатамі сталі 189 арганізацый і прадпрыемстваў, паведаміў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір СЯМАШКА. Сёлета дыпломы атрымалі 13 прадпрыемстваў, якія ўпершыню сталі лаўрэатамі прэміі, 6 арганізацый — паўторна, а дзве — удастоены звання дыпламанта. «Яны крыху не дацягнулі, каб стаць лаўрэатамі, але мы палічылі патрэбным іх таксама адзначыць», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Паляпшэнне якасці айчыннай прадукцыі і паслуг з'яўляецца адным з элементаў дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Уладзімір Сямашка ўпэўнены, што гандляваць на сусветным рынку цяпер можна толькі сапраўды якасным таварам. Тым больш што за апошнія 10 гадоў доля прамысловай вытворчасці Беларусі павялічылася ў 2,3 раза. Каля 65% айчыннага прадукту прадаецца за мяжу. Таму сёння барацьба за якасць стала патрабаваннем эканамічнага жыцця краіны.

У конкурсе традыцыйна ўдзельнічаюць прамысловыя прадпрыемствы, арганізацыі сферы паслуг, адукацыі, транспартнай галіны, будаўніцтва і энергетыкі. Прыкладна палова сёлетніх лаўрэатаў дзейнічае ў сферы паслуг, якая мае для нас вельмі важнае значэнне, бо яна працуе не толькі на карысць народа, але і стварае пэўны экспартны патэнцыял. У гэтым годзе мы павінны паставіць на экспарт прадукцыі і паслуг больш чым на 60 млрд долараў (на 9% больш за леташні аб'ём).

Гаворачы аб умовах правядзення конкурсу, Уладзімір Сямашка паведаміў, што яны распрацоўваліся з улікам вопыту правядзення такіх конкурсаў у краінах Еўрасаюза. Крытэрыі ацэнкі ўдзельнікаў адлюстроўваюць сусветныя тэндэнцыі. Гэта ў першую чаргу тычыцца канкурэнтаздольнасці тавараў па ўсіх параметрах. Улічваўся агульны ўзровень арганізацыі вытворчасці, дзе разглядаўся ў тым ліку аспект тэхнікі бяспекі і прамысловай санітарыі. Акрамя таго, пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўпор рабіўся на нарошчванне прадпрыемствамі экспартнага патэнцыялу. Першы віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што ў перыяд інавацыйнай айчыннай эканоміка патрабуе ўкладання ў развіццё прамысловасці і бізнесу буйных інвестыцый. Толькі ў гэтым выпадку цяпер можна дасягнуць неабходных поспехаў пры прасоўванні беларускіх тавараў і паслуг за межы краіны. Гэта праца, на думку Уладзіміра Сямашкі, асабліва актуальная ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза, уваходжаннем Беларусі ў АЭП і тым, што Расія, якая з'яўляецца асноўным рынкам збыту для нас, стала членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА паведаміў, што плануецца прыцягнуць да ўдзелу ў такім конкурсе прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу. Справа ў тым, што ўжо цяпер многія падобныя прадпрыемствы дэманструюць дастаткова высокія паказчыкі якасці і канкурэнцыі. Сёння камітэт імкнецца матываваць да ўдзелу ў конкурсе большую колькасць прадпрыемстваў. «Галоўнае, каб у краіне была не проста вялікая колькасць паспяховых прадпрыемстваў, але каб уся прамысловасць краіны займалася пытаннямі якасці. Такую задачу мы павінны вырашыць паўсюдна, практычна на любым прамысловым прадпрыемстве, пры арганізацыі сферы паслуг, будаўніцтве і гэтак далей», — лічыць кіраўнік Дзяржстандарта.

На цырымоніі таксама былі адзначаны нагрудным знакам «Лідар якасці» кіраўнікі шэрагу прадпрыемстваў, якія дасягнулі найвышэйшых вынікаў у галіне якасці прадукцыі (паслуг) і сістэмнага менеджменту, уручаны дыпломы пераможцам конкурсаў «Лепшы менеджар па якасці» і «Лепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці» 2013 года.

Сяргей КУРКАЧ

ЭНТУЗІЯСТЫ-ЦВЯРОЗНІКІ

■ Супраць залежнасці

У краіне дзейнічаюць 70 груп ананімных алкаголікаў

Алкагалізм нездарма называюць сацыяльным захворваннем: людзі выкарыстоўваюць спіртное ў якасці ўніверсальнага антыдэпрэсанту і запаўняльніка маральнай пустаты. Па інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі на яго хварэюць (толькі па афіцыйнай статыстыцы) 170 тысяч чалавек, а яшчэ прыкладна палова ад гэтай колькасці стаіць на прафілактычным уліку. Увогуле ж атрымліваецца, злоўжываюць алкаголем 250 тысяч чалавек — насельніцтва вялікага горада.

Спосабаў лячыць хваробу шмат. Адзін з іх — гэта збор колішніх сабутэльнікаў не для таго, каб у чарговы раз «скінуцца на траіх», а падзяліцца сіламі і ўласным вопытам. Такой тактыкі прытрымліваецца таварыства ананімных алкаголікаў, супрацоўнікі Офіса якога згадзіліся пагутарыць з карэспандэнтам «Звязды». Па вядомых прычынах іх імёны не называюцца.

ХТО ТАКІЯ АНАНІМНЫЯ АЛКАГОЛІКІ?

«Гэта цалкам добраахвотнае сусветнае таварыства, якое аб'ядноўвае мужчын і жанчын розных узростаў, сацыяльнага статусу, узроўню адукацыі, якія збіраюцца для таго, каб пастаянна падтрымліваць стан цвярозасці. Жаданне кінуць піць і ёсць галоўная ўмова членства. Удзельнікі таварыства не плацяць якіх-небудзь узносаў. Мы не атрымліваем грашовай і рэчавай дапамогі з-за мяжы, не бяром ахвяраванняў ад людзей, якія не ўваходзяць у таварыства. Усё фінансаванне адбываецца выключна на добраахвотнай аснове, грошы ахвяруюць удзельнікі. Мэта нашай дзейнасці — заставацца цвярозымі і дапамагаць іншым алкаголікам займець здаровы цвярозы лад жыцця. Мы не адносімся да якіхсьці рэлігійных арганізацый, палітычных груповак...

Механізм нашага функцыянавання просты. Таварыства ў кожнай краіне складаецца з асобных груп. Між іншым, іх у свеце налічваецца каля 125 тысяч — а гэта 2-3 мільёны чалавек. Дакладнай лічбы назваць нельга, бо гэтая статыстыка не вядзецца наўмысна. Колькасць людзей у групе, якія збіраюцца для таго, каб падзяліцца вопытам, таксама жорстка не рэгламентуецца. Галоўнае, каб іх было мінімум два. У Беларусі ж працуюць 70 груп ананімных алкаголікаў, з іх толькі ў Мінску — 24. Прыходзілі да нас і юнакі, і людзі ва ўзросце за 60».

ЯК ЧЛЕНЫ ТАВАРЫСТВА ДАПАМАГАЮЦЬ АДНО АДНАМУ?

«Галоўнае, каб чалавек пераадолеў страх і сказаў сабе: «Так, я залежны ад алкаголю. Але не хачу больш піць — дапамажыце мне вылезці з гэтай багны». Бо галоўныя прынцыпы нашай працы, акрамя ананімнасці, — гэта шчырасць і добрасумленнасць не толькі перад людзьмі навокал, але і перад самім сабой. Зразумела, што праграма таварыства ананімных алкаголікаў прадугледжвае стапрацэнтнае адмаўленне ад выпіўкі. Цвярозасць дасягаецца на аснове праграмы дзеянняў «Дванаццаць крокаў». Накіравана яна не толькі на культывацыю ў свядомасці такіх маральных якасцяў, як адказнасць, сумленнасць, дысцыплінаванасць, карыснасць, але і на «інвентарызацыю» этапаў свайго жыцця. Дасягаецца гэта тым, што адзін алкаголік непасрэдна гутарыць з другім.

Члены таварыства рэгулярна збіраюцца на сустрэчах, якія бываюць закрытымі і адкрытымі. У першых могуць удзельнічаць толькі тыя людзі, якія пакутуюць на залежнасць ад алкаголю. На адкрытыя сустрэчы могуць прыходзіць і тыя, хто хоча пераняць вопыт ананімных алкаголікаў у дасягненні цвярозасці. Ананімнасць — бадай што галоўны і важнейшы крытэрый абароны для навічка. У яго тут не спытаюць пашпартных даных, не паставяць на ўлік у наркалагічным аддзяленні, не зарэгіструюць, не паведамяць на працу».

ЯК ВЫГЛЯДАЮЦЬ СТАСУНКІ АНАНІМНЫХ АЛКАГОЛІКАЎ З РАЗНАСТАЙНЫМІ ГРАМАДСКІМІ СТРУКТУРАМІ?

«Мы не ўваходзім у іх склад, хаця з імі супрацоўнічаем. Мы не займаемся пастаноўкай дыягназаў, але пры гэтым у нас наладжаны добрыя кантакты з медыцынскімі работнікамі. Напрыклад, гэта праяўляецца тады, калі стаіць пытанне аб неабходнасці шпіталізацыі чалавека. Актыўна супрацоўнічаем з Дэпартаментам па выкананні пакаранняў МУС Беларусі — наведваем лячэбна-працоўныя прафілакторыі і папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу — так званыя «хіміі». Ідуць нам насустрач і адміністрацыі некаторых раёнаў, дзе сітуацыя з алкаголем проста катастрафічная».

ЧАГО НЕ РОБІЦЬ ТАВАРЫСТВА?

«Мы не захоўваем якіясьці запісы аб нашых удзельніках і не займаемся іх уцягненнем у нашы рады. Ніякага кантролю за нашымі членамі не вядзецца. Мы не ставім дыягназаў і не прымаем ніякай аплаты за свае паслугі. Часта нас блытаюць з арганізацыямі сацыяльнага кірунку. Але мы не забяспечваем людзей жыллём, харчаваннем, адзеннем, працай, грашыма...»

Валяр'ян ШКЛЕННІК

АБ'ЯЎЛЕНЫ КОНКУРС «ЛЕПШЫЯ ТАВАРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА РЫНКУ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ»

Чарговы, чатырнаццаты, конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» арганізуецца з мэтай павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, стварэння добрай рэпутацыі беларускіх тавараў на расійскім рынку.

Конкурс праводзіцца ў рамках Саюзнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі» з 2001 года. Удзельнічаць у ім могуць юрыдычныя асобы, незалежна ад формаў уласнасці, і індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку.

Вылучэнне прадукцыі праводзіцца па наступных намінацыях: харчовыя тавары, прамысловыя тавары для насельніцтва, вырабы народных і мастацкіх промыслаў, прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння, паслугі.

Усе тавары прымаюцца да разгляду пры ўмове іх пастаўкі ў Расійскую Федэрацыю на працягу не менеў за адзін год.

Арганізацыі, якія жадаюць удзельнічаць у конкурсе, падаюць да 15 ліпеня 2014 года заяўку і камплект дакументаў у сакратарыят Камісіі па падвядзенні вынікаў конкурсу, што сфарміраваны пры Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыі, тавары якіх удастоены звання лаўрэата конкурсу, узнагароджваюцца дыпломам і атрымліваюць права размяшчэння знака (лагатыпа) конкурсу на тавары і яго ўпакоўцы, этыкетцы (ярлыку), а таксама выкарыстання яго ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

Звесткі аб таварах-лаўрэатах і іх вытворцах размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарту і Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі», а таксама ў каталогу Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі», які рассылаецца ў органы дзяржаўнага кіравання Расійскай Федэрацыі, іншыя зацікаўленыя арганізацыі.

Падрабязная інфармацыя аб конкурсе размешчана на інтэрнэт-сайце Дзяржстандарту (www.gosstandart.gov.by/Конкурсы в области качества).

Святлана БУСЬКО.

ВУЧНІ — ПАД ПІЛЬНЫМ ВІДЭАВОКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Безумоўна, дарослыя ўлічылі і тое, што вучні могуць проста забыць або згубіць персанальную картку. У гэтым выпадку іх прапусціць вахцёр, ролю якога ніхто не адмяняў. Ну а згублены пропуск школьніку адновяць праз некаторы час. Дарэчы, у гэтым выпадку дзякуючы спонсарам усё абышлося бясплатна, але ж кошт сістэмы відэаназірання — ад Br80 млн да 100 млн. І ў іншых школах на апаратуру кантролю надалей будуць «скідвацца» бацькі.

Дарэчы, іх думку ўлічвалі пры ўстаноўцы відэакамер. У школе, дзе вучыцца 1645 дзяцей, было праведзена апытанне на кожнай паралелі класаў. Між тым, менавіта ў гэтым раёне Гомеля, дзе вялікая колькасць дзяцей з сем'яў, якія стаяць на розных уліках, вельмі важным становіцца пільны кантроль за сітуацыяй, адзначае выконваючая абавязкі дырэктара школы Алена Ярмолкіна:

— Бацькоўскі камітэт вырашыў, што нам гэта патрэбна. Прапускная магчымасць турнікета высокая, усе паспяваюць. Бацькі пры неабходнасці могуць прайсці са сваім дзіцем.

Начальнік аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Алена Ляшук кажа, што першая ў Гомелі электронная сістэма кантролю і відэаназірання за навучэнцамі дае магчымасць бацькам бачыць увесь працэс на сваіх камп'ютарах у анлайн-рэжыме.

— Усю інфармацыю таксама бачыць і маніторыць дырэктар і супрацоўнік на вахце. З дапамогай індывідуальнай карткі фіксуецца і час знаходжання на працы настаўнікаў. Такім чынам кіраўнік школы лёгка кантралюе свой педагагічны калектыў. Сёння ўсё больш жорсткімі становяцца патрабаванні праваахоўных органаў да бяспекі ў школе, і таму сістэма відэаназірання апраўдана з усіх бакоў. Між іншым, у многіх установах горада настаўнікі, навучэнцы і бацькі даўно карыстаюцца электроннымі дзённікамі, таму ніхто не бачыць нічога дзіўнага ў новым відзе кантролю.

Школа становіцца ўсё больш закрытай сістэмай. Без дазволу адміністрацыі ў яе ўжо нельга трапіць. Цяпер ідзе адладка тэхнікі, і першы вопыт, адназначна, не стане апошнім. Мяркуецца, што за наступнае лета яшчэ некалькі школ у Гомелі будуць абсталяваны аналагічнымі сістэмамі відэаназірання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КЕДРЫ ЗАШУМЯЦЬ АБ ПЕРАМОЗЕ

У Баранавіцкім раёне высадзілі не зусім звычайны кедравы гай. 180 саджанцаў маладога кедра размясцілі так, што з вышыні птушынага палёту чытаецца: «Квітней і мацней, Маці Зямля».

Кедравы гай стаў вынікам грамадскай патрыятычнай ініцыятывы. Мінчанін Аляксандр Рахоўскі такім чынам увекавечыў памяць свайго дзеда і іншых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія здабылі Перамогу. Малады чалавек даўно захапляецца экалогіяй, супрацоўнічае з расійскімі экалагічнымі групамі «Падары зямлі сад», «Рух жыцця» і іншымі. Сябры-расіяне і дапамаглі з саджанцамі самага моцнага дрэва.

Калі ўсё было падрыхтавана, Баранавіцкі лясгас адвёў пляцоўку ва ўрочышчы Сачыўкі. Сюды прыехалі валанцёры з Мінска, акцыю падтрымала і моладзь Баранавіч. Засталося чакаць, калі ўзнімуцца маладыя кедры і напомняць аб Вялікай Перамозе.

Яна СВЕТАВА.

■ Футбол

ЗА КУБАК БЕЛАРУСІ ПАЗМАГАЮЦЦА «ШАХЦЁР» І «НЁМАН»

Усёпаглынальная радасць і татальная цішыня. Менавіта такія розныя «атмасферы» панавалі ў раздзявальнях гродзенскага «Нёмана» і «Мінска». Пасля непрыемнай серыі паражэнняў у чэмпіянаце гродзенцы, як той казаў, ачунялі і на даволі вязкім ад дажджу полі мінскага «Тарпеда» далі бой сталічнай дружыне.

Момант сустрэчы «Мінск» — «Нёман».

Перавага гасцей яскрава адчувалася ў другім тайме, калі галы градам пасыпаліся ў вароты Уладзіміра Бушмы. У выніку 3:1 — гасцявая вікторыя «нёманцаў», якая не толькі спыніла непрыемную серыю, але і дазволіла ім трапіць у Лігу Еўропы. Рэч у тым, што другім фіналістам стаў салігорскі «Шахцёр», які ў Магілёве перайграў мясцовы «Дняпро» (3:1). Каманда Сяргея Бароўскага яшчэ леташнім снежнем, дзякуючы сярэбраным медалям першынства, заваявала месца ў еўракубках, а таму яшчэ адна пуцёўка, незалежна ад выніку, аўтаматычна пераходзіць фіналісту Кубка краіны.

— Гэта быў па ўсім вельмі важны матч, — пасля сустрэчы прызнаўся **Сяргей САЛАДОЎНІКАЎ, галоўны трэнер «Нёмана»**. — Усе ведаюць, як мы гулялі апошнія матчы (*каманда з Гродна саступіла ва ўсіх трох турах чэмпіянату*. — **Аўт.**)... Але я бачыў, з якімі вачыма хлопцы рыхтаваліся да гэтай гульні, і я ведаў, што мы згуляем добра. Што тычыцца чэмпіянату, мы зробім усё, каб выправіць сітуацыю. Ён толькі пачаўся.

Застаецца дадаць, што фінальны паядынак за Кубак краіны адбудзецца 3 мая і пройдзе на сучаснай «Барысаў-Арэне».

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ЦІ МОЖНА ПРЫВАТЫЗАВАЦЬ ЖЫЛЛЁ ЗА КРЭДЫТ АБО ЧЭКІ?

Жыхарка вёскі Ліцляны Уздзенскага раёна Валянціна Віктараўна Вінаградава хацела б прыватызаваць жыллё, атрыманае ад колішняга калгаса яшчэ ў 1980-я гады. Наколькі мы зразумелі, гэта была раней службовая кватэра. У калгасе, перад выхадам на пенсію, жанчына адпрацавала 17 гадоў. Дазвол на прыватызацыю, па словах чытачкі, атрыманы. Каштуе гэтая працэдура 78 мільёнаў. Заяўніца хацела б атрымаць у банку крэдыт для прыватызацыі жылля, але ёй у гэтым адмовілі. Ці справядліва, пытаецца яна. Пагасіць крэдыт жанчына хацела б імяннымі прыватызацыйнымі чэкамі «Жыллё». Каштоўных папер яна мае 640. Усе чэкі належаць асабіста ёй і ва ўстаноўленым парадку, як сказала заяўніца, былі ў свой час перарэгістраваны.

Ва ўсіх гэтых пытаннях, якія датычыліся набыцця ва ўласнасць жылога памяшкання, па просьбе рэдакцыі дапамог разабрацца Уздзенскі раённы выканаўчы камітэт.

«У адпаведнасці з артыкулам 134 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прыватызацыя жылых памяшканняў — гэта набыццё грамадзянамі ва ўласнасць займаемых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, прадастаўленых ім у адпаведнасці з заканадаўствам.

У нашым выпадку набыццё ва ўласнасць жылога памяшкання грамадзянкай Вінаградавай В.В. магчымае на ўмовах дагавора куплі-продажу.

Ва ўстановах ААТ «Беларусбанк», згодна з дзейнымі ўмовамі, выдача крэдытаў фізічным асобам на набыццё жылога памяшкання не прадугледжана.

Па інфармацыі разлікова-касавага цэнтра № 2 у г.Узда філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» г. Дзяржынска, выдача фізічным асобам крэдытаў на набыццё жылога памяшкання прыпынена з кастрычніка 2013 года.

Згодна з палажэннем «Аб парадку індэксацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.11.2006 г. № 1529, з заявай аб індэксацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» могуць звярнуцца толькі грамадзяне, якія стаялі на ўліку як маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і выказалі жаданне выкарыстаць належныя ім чэкі «Жыллё» на фінансаванне будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах (пазыках), узятых і выкарыстаных на ўказаныя мэты».

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАВІНЫ

ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ ЛЕТНІКІ: ПОЎНАЕ ПАГЛЫБЛЕННЕ...

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» запрашае школьнікаў паўдзельнічаць летам у міжнародных лінгвістычных летніках «Масты адукацыі».

Сёлета ў Беларусі, Польшчы і Чэхіі будзе арганізавана 5 міжнародных дзіцячых летнікаў па навучанні гутарковай англійскай, кітайскай і французскай мовах. Сёлета ў лінгвістычных летніках будуць задзейнічаны педагогі з Германіі, Нідэрландаў, Францыі, Вялікабрытаніі, Кітая, Швецыі, Ірландыі, ЗША, Аўстраліі, а таксама беларускія. Выкладанне ў летніках праводзіцца з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў навучання з поўным паглыбленнем у моўнае асяроддзе.

Тым, каго зацікавілі такія летнія перспектывы, трэба запоўніць на сайце Беларускай Асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА (www.belau.info) анлайн-анкету. Прыём электронных анкет ажыццяўляецца да 20 красавіка. Удзельнікі летнікаў набіраюцца на конкурснай аснове. Адной з умоў з'яўляецца вывучэнне замежнай мовы не менш як адзін год.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ВОБРАЗ РАДЗІМЫ Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ»

У Магілёве стартаваў XIX Міжнародны пленэр па жывапісе.

Удзел у ім прымаюць 27 мастакоў з Беларусі, Расіі, Індыі, Ізраіля, Арменіі, Сербіі, Кітая, Малдовы. На гэты раз пленэр прысвечаны 100-годдзю са дня нараджэння мастака Паўла Масленікава і 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго ўдзельнікі ўжо пабывалі на радзіме Паўла Васільевіча ў магілёўскіх Княжыцах, дзе прысутнічалі на ўрачыстым адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў гонар майстра. Падчас пленэру ў мастакоў будзе магчымасць натхніцца краявідамі палаца-паркавага комплексу ў Жылічах і іншых маляўнічых куткоў Магілёўшчыны. Іх чакае насычаная разнастайная праграма, у якой прадугледжана паездка ў Мінск з наведваннем музеяў і тэатраў.

А вынікам пленэру стане справаздачная выстава карцін у абласным мастацкім музеі імя П. Масленікава, якая адбудзецца 24 красавіка. Па словах намесніка дырэктара гэтай установы Святланы Строгінай, за час існавання пленэру фонд музея папоўніла амаль 1500 работ мастакоў з розных краін.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАДЗЕІ

СПАЗНІЎСЯ НА ПЯЦЬ ДЗЁН...

Менавіта такі прамежак часу стаў прычынай канфіскацыі аўтамабіля коштам каля 250 мільёнаў рублёў.

Як паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні, аўто «BMW 535» 2009 года выпуску было дастаўлена ў пункт мытнага афармлення «Салігорск» для падаўжэння тэрміну часовага ўвозу. Гаспадар машыны — грамадзянін Рэспублікі Абхазія, які мае від на жыхарства ў Беларусі.

Па законе іншаземныя фізічныя асобы маюць права часова ўвозіць на тэрыторыю Мытнага саюза транспартныя сродкі для асабістага карыстання на тэрмін, які не перавышае адзін год. На гэты час уладальнік машыны вызваляецца ад аплаты мытных плацяжоў за яе, але калі ёсць неабходнасць прадоўжыць тэрмін часовага ўвозу, патрэбна загадзя паклапаціцца пра гэта. Як высветлілася, уладальнік «BMW 535» спазніўся на пяць дзён. Па гэтай прычыне машыну канфіскавалі. Далейшы лёс справы вырашыць суд.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ФАКТЫ

ТЭРМІН ЗА СПАЙС

Да васьмі гадоў пазбаўлення волі прыгаварыў Брэсцкі суд вытворцу спайсу.

У калонію ўзмоцненага рэжыму адправіцца мінчанін, які пражываў у Брэсце на здымнай кватэры і рабіў небяспечныя курыльныя сумесі. Да звычайнай травы падмешваў асабліва небяспечнае рэчыва, якое прывозіў з Мінска, папярэдне заказаўшы па інтэрнэце. Мінулым летам аператыўнікі затрымалі дылера з двума пакетамі спайсу, у якім было больш як 2 грамы небяспечнага псіхатропу. А праз месяц на здымнай кватэры, дзе малады чалавек выкрабляў сумесі, знайшлі ўжо 10 грамаў асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва. Хлопцу ўсяго 19 гадоў, і ў гэтым узросце ён знайшоў спосаб зарабіць вялікія грошы на горы і няшчасці іншых. Цяпер будзе час падумаць аб далейшым жыцці.

Яна СВЕТАВА.

25.04.2014 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций общества.
2. О внесении изменений и дополнений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 18.04.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400022625 Наблюдательный совет.

■ Здаровае харчаванне

Дзе выраблюць ідэальны рапсавы алей?

Напрыканцы мінулага года Гомельскі тлушчавы камбінат увёў у эксплуатацыю цэх рафінацыі, вінтэрызацыі і дэзадарацыі алею бесперапыннага дзеяння магутнасцю 140 тон у суткі. Тлушчавы камбінат спецыялізуецца наогул на вытворчасці маргарынаў, маянэзу, алею і мыла. Прадпрыемства, якое з'яўляецца самым буйным у краіне вытворцам алейна-тлушчавай прадукцыі, паслядоўна ажыццяўляе тэхнічнае пераўзбраенне.

— Летась мы рэалізавалі два інвестыцыйныя праекты: быў узведзены новы цэх рафінацыі алеяў і ўстаноўлена комплексная лінія вытворчасці туалетнага мыла, — расказвае **першы намеснік дырэктара Гомельскага тлушчавага камбіната Таццяна ПАЛЯЙЧУК.** — Новы цэх рафінацыі аб'ядноўвае ўсе этапы вырабу алеяў. Абсталяванне замежнай вытворчасці дазваляе апрацоўваць любыя віды алеяў — сланечнікавы, рапсавы, аліўкавы і г.д. У асноўным нам даводзіцца набываць сыравіну ў Расіі і ва Украіне, аднак часткова мы выкарыстоўваем і айчынны сланечнік, а рапс, зразумела, увесь наш, бо вельмі добра расце ў нашым клімаце...

Яшчэ на пачатку 2000-х Гомельскі тлушчавы камбінат укараніў тэхналогію рафінацыі і дэзадарацыі рапсавага алею. Атрымаўся высакаякасны прадукт, які заслужыў ужо ўзнагароды на міжнародных выставах. Ступень апрацоўкі сыравіны вельмі высокая — гатовы бутыляваны прадукт не мае вялікай колькасці прымесяў (у рапсавым алеі іх вельмі шмат) і пры гэтым захоўвае ўсе каштоўныя якасці.

Рапсавы алей сёння шырока прадаецца і ўжываецца ў самых розных краінах свету, а ў некаторых краінах ён наогул лічыцца "каралём" усіх алеяў. А ўсё таму, што гэты алей збалансаваны, багаты на вітамін Е і асабліва на амега-3-кіслоты (дзве сталовыя лыжкі пакрываюць штодзённую норму), валодае нядрэннай тэрмаўстойлівасцю.

У новым цэху рафінацыі — чатыры секцыі. Кожная секцыя — гэта пэўны працэс вытворчасці, які ажыццяўляецца ў некалькі этапаў. Самае важнае на ўсіх гэтых этапах са складанымі тэхналагічнымі назвамі — выдаліць прымесі і воск, каб алеі былі чыстымі, як сляза.

І смачна, і з вітамінамі

Рапсавы алей "Жарфритюр" змяшчае спецыяльную харчовую дабаўку-сумесь антыаксідантаў — токаферолаў (вітамін Е). Гэтая натуральная дабаўка не дазваляе алею награвацца звыш 175 градусаў, што перашкаджае ўтварэнню канцэрагенных рэчываў. Алей не пеніцца, не прыгарае. Да таго ж гатовы прадукт змяшчае менш калорый за кошт змяншэння паглынання ім тлушчу на 10 працэнтаў.

Гандлёвая марка "Полезное" падтрымлівае тэндэнцыі здаровага харчавання, робіць ежу не толькі смачнай, але і карыснай. Серыя алеяў і бутэрбродны прадукт "Полезный" змяшчае вітаміны А, Е, $Д_3$ і незаменныя поліненасычаныя тлустыя кіслоты амега-3 і амега-9, што пацверджана РНПЦ гігіены.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«АФРЫКАНСКІЯ» СТРАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Старшыня райвыканкама Васіль ВІЦЮНОЎ у адказ на гэтыя абвінавачанні запрашае паглядзець усё на свае вочы. Нават з яго кабінета. У мінулым лістападзе на МТФ усталявалі сістэму відэаназірання, і цяпер ёсць магчымасць сачыць за ўсім, што там адбываецца, не толькі ў райвыканкаме, але і ў аблвыканкаме. Гляджу на экран манітора. Вось пад'езд да фермы, памяшканні для жывёлы, відаць, як людзі займаюцца прыборкай. «Гэта тая ферма, дзе, як напісана ў лісце, каровы ў гноі патанаюць, — іранізуе кіраўнік раёна і дадае: — Як там ідуць справы, лепей паглядзім на месцы».

«Ніхто не забараняе вырошчваць іншую жыўнасць. Мы нават рэкамендуем: заводзьце бычкоў, прыходзьце, выпішам усім ахвотным. На тых кармах, што з'есць парася, можна выгадаваць 2 бычкоў».

Па даросе ў Сялец, дзе знаходзіцца МТФ, заязджаем на свінаферму «Сож-Агра» ў аграгарадок Падлужжа. На жаль, трапіць туды ні карэспандэнту, ні нават кантралёрам не пашчасціла — пропуск на свінакомплекс ажыццяўляецца толькі з дазволу дзяржаўнага ветэрынарнага інспектара. На ўездзе бачым папераджальную таблічку: пабочным асобам уваход забаронены. Звонку ўсё выглядае прыстойна.

Раённы ветурач Міхаіл КАСЦЯНКОЎ звяртае ўвагу на тое, што санпрапускнікі ёсць — гэта «вунь той драўляны навес каля муравана га будынка». Вакол чыста. У тое, што ўнутры таксама парадак, прыходзіцца верыць на слова: на свінаферме відэакамер няма. Невядомы заяўнік між тым сцвярджае, што свінні галадаюць, а падзеж жывёлы перавышае норму.

— Сутачная патрэба — 3 тоны камбікармоў, — рэагуе на абвінавачанні **кіраўнік СВК «Сож-Агра» Мікалай МАЦКЕВІЧ.** — Бяром грануляваны корм на Клімавіцкім КХП, ёсць накладныя, якія пацвярджаюць, што ён завозіцца ў поўным аб'ёме. Рабочы дзень з 8.00 да 17.00, свіней кормяць раніцай і каля 16.00. На ферме працуе сістэма вентыляцыі, праведзена ацяпленне, для работнікаў функцыянуюць мужчынская і жаночая душавыя.

— А праўда, што заробак тут складае ўсяго 300-700 тысяч рублёў? — цікаўлюся я.

— На ферме працуе 12 чалавек, — кажа кіраўнік. — Сярэдні заробак складае 2,3 мільёна. Мы жывём у часы рыначных адносін: тое, што вырабілі, тое і атрымалі.

— Рацыён вытрымліваецца, падзеж жывёлы невялікі, па рэалізацыі таксама няма пытанняў, — дадае **галоўны спецыяліст КДК Магілёўскай вобласці Антаніна ЛОНСКАЯ,** якая разам з калегам Сяргеем Парцянкіным паспела азнаёміцца з «бухгалтэрыяй» гаспадаркі. — Дзве жанчыны сапраўды атрымалі на рукі невялікія грошы — у межах 300-400 тысяч рублёў. Гэта пры тым, што адной было налічана 2,1 мільёна рублёў, другой 2,7 мільёна. Але з іх заробкаў адлічваюцца сродкі на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на выхаванні ў дзяржавы. Акрамя гэтага, за невыкананне службовых абавязкаў яны заплацілі за тутэйшае харчаванне ў 100-працэнтным памеры.

Заложнікі «афрыканскай чумы»

Не трэба быць вялікім псіхолагам, каб зразумець, што невядомы аўтар скаргі дзесьці згусціў фарбы, каб пераканаць сваіх адрасатаў у тым, што «Сож-Агра» трэба закрыць. Навошта? Каб зноў завесці сваіх парсючкоў. Бо пакуль існуе канкурэнт, гэта нерэальна, таму што ў краіне існуе забарона на ўтрыманне гэтых жывёл у радыусе 5 кіламетраў ад свінафермаў. А аграгарадкі Сялец і Падлужжа якраз трапляюць у гэтую зону. У лісце нават ёсць «парада»: свінаферму трэба закрыць, а жывёл перадаць двум больш буйным раённым СВК — «Віхра» і «Мазалаўскі». Ці магчыма такое? Раённыя ўлады сцвярджаюць, што не.

— У нас ёсць іншая пагражальная зона — ад Хіславіцкага, Шумячыцкага і Красенскага раёнаў Смаленскай вобласці, — кажа раённы ветурач Міхаіл Касцянкоў. — Ніякага руху свіней, згодна з Пастановай Саўміна № 728, не павінна адбывацца. Мы не можам харчовую праграму ўсёй краіны падвяргаць небяспецы.

Пагроза і насамрэч існуе. Усходнеафрыканская чума для чалавека небяспекі не ўяўляе, але свінні ад яе гінуць сотнямі. У Расіі зафіксавана некалькі сотняў выпадкаў захворвання, эканамічныя страты перавысілі дзясяткі мільярдаў рублёў. У мінулым чэрвені ў Смаленскай вобласці пры лабараторным даследаванні проб ад двух дзікоў, якія загінулі на тэрыторыі паляўнічай гаспадаркі, быў атрыманы станоўчы вынік на афрыканскую чуму. А гэта менавіта тая вобласць, якую ад аграгарадка Падлужжа аддзяляе толькі рака.

— У нас расіяне нават маніторынг праводзілі, каб даведацца, ці можна нашу прадукцыю экспартаваць у іх краіну, — кажа Міхаіл Касцянкоў. — А на СВК «Сож-Агра» былі правяральшчыкі з Магілёўскага мясакамбіната, куды завозіцца наша свініна. Ніякіх парушэнняў не знайшлі.

Калі свіней нельга перамяшчаць па тэрыторыі раёна, дык што — ліквідаваць пагалоўе? Але ж гэта эканамічна не апраўдана. Акрамя таго, што прыйдзецца пусціць пад нож болей за 2000 свіней, дык яшчэ і закапаць у зямлю вялікія крэдытныя сродкі.

— Каля 10 гадоў ферма «Сож-Агра» прастойвала без пагалоўя, але ў 2010-м на рэканструкцыю фермы было ўзята 30 мільярдаў рублёў, — удакладняе Васіль Віцюноў. — Ужо адноўлены матачнае аддзяленне, цэх адкорму і дагадоўвання свіней. У хуткім часе збіраемся адрамантаваць і іншыя памяшканні. Пакуль пагалоўе невялікае, але яно будзе павялічвацца.

Аператар машыннага даення Святлана Чурбанава не скардзіцца на ўмовы працы.

Рэквіем па свіннях

Калі заробак на той жа ферме складае крыху болей за 2 мільёны, без асабістай падсобнай гаспадаркі, вядома, не абысціся. Менавіта свінагадоўля і была для жыхароў дадатковым заробкам. На 353 жыхары Падлужжа яшчэ ў мінулым верасні ў прыватных гаспадарках прыпадала 150 свіней. Згодна з 758-й Пастановай Саўміна ўсе яны былі ліквідаваны. **Старшыня Краснагорскага сельвыканкама Людміла КАВАЛЁВА** ўспамінае, што насельніцтва на просьбу пазбавіцца ад свіней рэагавала паразнаму.

— На тэрыторыі сельсавета 7 з 13 населеных пунктаў трапілі ў 5-кіламетровую зону, — кажа яна. — Людзі, зразумела, прызвычаіліся трымаць свіней, але што рабіць, калі склалася іншая жыццёвая неабходнасць. Асабіста хадзіла па дварах, угаворвала людзей, нават складала спісы тых, у каго свінні засталіся. Некалькі месяцаў давялося праводзіць гэтую работу, каб людзі, нарэшце, далі згоду адмовіцца.

Ці ёсць альтэрнатыва?

Ад прафілактычных дзеянняў па недапушчэнні афрыканскай чумы свіней у Мсціслаўскім раёне пацярпелі не толькі жыхары Сяльца і Падлужжа. Але насельніцтва іншых вёсак — тых, што трапляюць у 5-кіламетровую зону гаспадарак «Віхра» і «Мазалаўскі» — паставілася да праблемы з разуменнем. Для іх свет клінам на адных свіннях не сышоўся.

Людзі, зразумела, прызвычаіліся трымаць свіней, але што рабіць, калі склалася іншая жыццёвая неабходнасць?

— Ну што рабіць, калі іх нельга трымаць? — разважае Міхаіл Касцянкоў. — Але ж ніхто не забараняе вырошчваць іншую жыўнасць. Мы нават рэкамендуем: заводзьце бычкоў, прыходзьце, выпішам усім ахвотным. На тых кармах, што з'есць парася, можна выгадаваць 2 бычкоў. На сходах неаднойчы пра гэта казалі насельніцтву. Калі бычкі не падыходзяць, кароўку трымайце, малако ж таксама можна прадаваць. Курэй заводзьце, качак, авечак...

Тым, хто, акрамя свіней, нічога іншага трымаць не хоча, кіраўніцтва раёна прапаноўвае заводзіць гаспадарку за межамі тэрыторый, дзе гэта забаронена. «Ёсць нават спецыяльныя жывёлагадоўчыя памяшканні, якія пустуюць, — бяры за 1 базавую і зарабляй грошы», — раіць Васіль Віцюноў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

КАМПЕТЭНТНА

Галоўны спецыяліст Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці Сяргей ПАРЦЯНКІН:

— Тых парушэнняў, якія былі пазначаны ў зварооце, мы не знайшлі. Неабходнасці ў тым, каб зачыняць гэтую ферму, таксама няма. Пакуль яна не вельмі рэнтабельная, гэта праўда: за мінулы год на СВК «Сож-Агра» было каля 600 мільёнаў рублёў страт. Адбілася тое, што тут бралі крэдыты, і гэта лягло на сабекошт. Але кіраўніцтва збіраецца адрамантаваць яшчэ 3 памяшканні і павялічыць пагалоўе да 4-5 тысяч жывёл. Гэта дасць магчымасць падняць заработную плату і стварыць новыя працоўныя месцы.

Што датычыцца СВК імя Чапаева, то там мы таксама вялікіх парушэнняў не знайшлі. Так, па дробязях. Напрыклад, у малочным блоку трэба падрамантаваць падлогу.

Начальнік упраўлення КДК Магілёўскай вобласці Вячаслаў АСМАЛОЎСКІ:

— Гэта не першы зварот з Мсціслаўскага раёна за апошні год. Сітуацыя зразумелая. Людзі трымалі свіней дзесяцігоддзямі, прызвычаіліся да гэтага, і тыя жорсткія захады, якія існуюць у нашай краіне па барацьбе з афрыканскай чумой, выклікалі незадаволенасць. Але вяскоўцы павінны разумець: рашэнне прынята на высокім узроўні, трэба яго выконваць. На месцах павінна весціся тлумачальная работа. Магчыма, улада тут дзесьці недапрацавала.

Быў прыклад у гэтым жа раёне, калі жыхары вёскі Ходасы прапанавалі раённаму кіраўніцтву дазволіць ім пакінуць свіней, а ферму СВК «Мазалаўскі» на 1000 галоў зачыніць: там не вытрымліваліся неабходныя санітарныя ўмовы. Сабралі сход, абмеркавалі ўсё і вырашылі пытанне на карысць насельніцтва. У СВК «Сож-Агра» іншая сітуацыя. Ферма ў добрым стане, больш за тое, кіраўніцтва гаспадаркі бачыць перспектывы. Калі ветнагляд іх падтрымае, насельніцтву давядзецца змірыцца і выконваць прынятае дзяржавай рашэнне.

Такія скаргі часцей за ўсё ананімныя. Але няма дыму без агню. Кіраўніцтву раёна трэба працаваць над тым, каб заробак вяскоўцаў быў большым. Сёння 2 мільёны — вельмі малыя грошы, каб на іх пражыць самому і пракарміць сям'ю. Вось калі даходы павялічацца, ніхто не будзе скардзіцца на тое, што нельга трымаць свіней.

■ Да ведама

ПАЛЮЙ, АЛЕ ГАЛАВЫ НЕ ГУБЛЯЙ

У сувязі з адкрыццём сезона палявання на самцоў цецерука і глушца Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь нагадвае, што за незаконную здабычу цецерука давядзецца пакрываць нанесеную прыродзе шкоду ў памеры 10 базавых велічынь, за глушца — 70 базавых велічынь, што аўтаматычна цягне за сабой крымінальную адказнасць.

— Каштоўнасць глушца абумоўлена яго нешматлікасцю ў прыродзе Беларусі (менш за 10 тысяч асобін), у той час як цецярук з'яўляецца больш распаўсюджанай птушкай сямейства цецеруковых. Паляванне на глушца цікавае яшчэ і з-за біялагічных асаблівасцяў гэтай птушкі: наблізіцца да яе можна, толькі падгадаўшы момант, калі, такуючы глушэц, па-асабліваму «шчоўкае» і «глухне» на некалькі секунд, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Працягваецца і сезон палявання на вадаплаўную дзічыну: гусь — белалобую і шэрую, гуменніка і канадскую казарку (акрамя некаторых паляўнічых угоддзяў — у асноўным па Брэсцкай і Віцебскай абласцях, дзе да 1 студзеня 2015 года, згодна з пастановай Мінпрыроды, дзейнічае забарона на гэты від палявання). Дзяржінспекцыя звяртае ўвагу паляўнічых на тое, што пры паляванні на птушыных трэба захоўваць правілы бяспекі: не страляць па птушцы, якая ўзлятае

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ніжэй чым 2,5 метра ва ўмовах абмежаванай бачнасці, на шум, шорах, па няясна бачнай цэлі, у тумане, прыцемках, супраць сонца і пры іншых неспрыяльных умовах.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

2014 IIHF WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

СТАРТУЕ «ХАКЕЙНЫ #ПЕРАХВАТ!»

Падчас правядзення ў Мінску з 9 па 25 мая чэмпіянату свету па хакеі інтэрнэт-праект ГУУС Мінгарвыканкама «Перахват» абвяшчае кампанію «Хакейны #перахват!»

Яна будзе складацца з двух асноўных этапаў. Першы — конкурс фотаздымкаў інтэрнэт-карыстальнікаў, прымеркаваных да тэматыкі надыходзячага сусветнага першынства. Галоўнай мэтай конкурсу з'яўляецца пошук пазітыўных момантаў пры правядзенні чэмпіянату свету па хакеі. Сюжэтам фотаздымка можа быць усё, што мае дачыненне да тэматыкі будучай дзеі: падзея, з'ява, назіранне, чалавек. Фотаздымкі неабходна накіроўваць на «Перахват» ці размяшчаць у «Твітары» з пазнакай #чм2014 і #перахват.

Другі этап — накіраванне «перахватчыкамі» інфармацыі пра розныя непрыемнасці ў спецыяльна створаную рубрыку. Яе галоўная мэта — дапамога актыўных мінчан у выяўленні і аператыўным выпраўленні праблемных момантаў гарадскога побыту. Гэтая рубрыка будзе дзейнічаць да канца чэмпіянату. У яе можна будзе паведамляць пра аўтахлам, няспраўныя святлафоры і сапсаваныя дарожныя знакі, гарадскіх вандалаў, грубасць і хамства кіроўцаў на дарогах, факты распіцця спіртных напояў і г.д.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ «Еўрабачанне-2014»

Тэа паедзе ў Данію без чызкейкаў, затое з гальштукам-бабачкай

— Тры чамаданы адзення назбіралася! — смяецца выканаўца. Але тут жа пераключаецца на больш сур'ёзны тон і расказвае, што для ўсёй беларускай дэлегацыі стылісты прыдумалі карпаратыўны стыль а-ля «mr Cheesecake»: модныя белыя кашулі (іх, дарэчы, пашылі беларускія вытворцы), класічныя цёмныя нагавіцы і гальштукі-бабачкі. Такі выгляд, як мяркуюць спецыялісты, дапаможа нашай камандзе вылучыцца вонкава ў агульным, зазвычай вельмі яркім, калейдаскопе «Еўрабачання».

У гэтым жа рэчышчы выканана і прома-прадукцыя: дыск і інфармацыйны буклет, які прадстаўляе беларускага артыста, магніты з краявідамі Мінска, а таксама спецыяльныя VIP-сувеніры для калег-тэлевізійнікаў і артыстаў з іншых краін, што ўдзельнічаюць у сёлетнім конкурсе. Дапамагаюць наладжваць стасункі з прадстаўнікамі розных краін і арганізоўваюць розныя піяр-акцыі ажно два піяршчыкі — адзін працуе на рускамоўную аўдыторыю, другая, брытанка Кэтрын Локет, — на англамоўную.

Але галоўнае, што павязе беларускі ўдзельнік на «Еўрабачанне» — безумоўна, сам конкурсны нумар на песню «Cheesecake». Ужо вядома, што ў ім, акрамя ўласна саліста Тэа (Юрыя Вашчука), будуць задзейнічаны бэк-вакалісты Дзяніс Ліс, Арцём Ахпаш і Юрый Селязнёў, а таксама танцоры Аляксандр Залескі і Андрэй Мартынаў.

— Як так атрымалася, што сабраліся «ў джазе толькі хлопчыкі»? — пацікавіліся мы.

— А вы чакалі, што будзе, як у кліпе, дзяўчына-прыгажуня? — ажыўляецца Тэа. — Вельмі часта нават калегі-артысты пытаюцца, ці будзе ўсё, як у кліпе. Я лічу, што прома-кліп і сцэнічны нумар — рэчы зусім розныя: калі кліп здымаецца на якім-небудзь айсбергу, напэўна, не трэба гэты ж айсберг рабіць і на сцэне. Канцэпцыя выступлення даволі

простая: мы з сябрамі ў добрым настроі гуляем па вуліцы і спяваем пра тое, што хопіць, нарэшце, называць хлопцаў «салодкімі чызкейкамі», мы ад гэтага ўжо стаміліся. Адпаведна з гэтай задумкай і падбіраліся ўдзельнікі — усе яны насамрэч не толькі маюць калегі па сцэне, але і добрыя сябры, выдатныя хлопцы, з якімі вельмі камфортна і лёгка працаваць. Наогул, я лічу, вельмі важна, што сёлета падабралася цудоўная каманда, дзе ўсе разумеюць адзін аднаго.

Увесь мінулы тыдзень спявак працаваў з запрошанымі замежнымі спецыялістамі — шведскай рэжысёркай Ціне Матулесі, якая рабіла пастаноўку нумара, і педагогам па вакале Алексам Панаі з Кіпра, які добра ведае спецыфіку конкурсу як на ўласным прыкладзе, так і па працы з іншымі артыстамі. Памятаючы пра тое, што лепшае — вораг добрага, усім знаёмы варыянт конкурснай песні вырашылі істотна не змяняць, каб не сапсаваць яе, а толькі крыху «дашліфаваць», палепшыць асобныя моманты.

Наколькі гэта ўдалося зрабіць — убачым ужо праз два з паловай тыдні. Пакуль жа «Cheesecake» актыўна падхоплівае публіка на прома-канцэртах, а выканаўца і ўся каманда нацэлены на максімальна добры вынік. Але прагнозы рабіць не бяруцца і пытанні пра магчымую перамогу сустракаюць з усмешкай. «Давайце не будзем загаварваць саміх сябе і артыста ў рамкі планаў, якое месца нам трэба заняць, а проста атрымаем задавальненне ад гэтага вялізнага, яркага свята!» — прапануе кіраўнік праекта «Еўрабачанне» ў Беларусі Вольга Шлягер.

Напярэдадні адлёту ў Капенгаген Тэа паспее яшчэ выступіць на вечарынцы ў Маскве, якую ладзяць прадстаўніцы Расіі сёстры Талмачовы з удзелам расійскіх эстрадных «зорак» і канкурсантаў са Швецыі, Румыніі, Азербайджана, Сан-Марына, а таксама возьме актыўны ўдзел ва ўласных «провадах» — афіцыйным мерапрыемстве з абсалютна неафіцыйнай назвай «Хлапечнік Тэа». Пажадаюць спеваку ўдачы і скажуць словы падтрымкі не толькі вядомыя беларускія артысты, але таксама пераможца «Еўрабачання-2009», нарвежац з беларускімі каранямі Аляксандр Рыбак і прадстаўнік нашай краіны на «Еўрабачанні-2008» Руслан Аляхно, які цяпер жыве і працуе ў Расіі.

А ўжо 28 красавіка беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі Маратам Маркавым адправіцца ў Данію, дзе стартуе так званы «Еўратыдзень». 30 красавіка ў Тэа адбудзецца першая рэпетыцыя на сцэне B&W Hallerne на востраве Рэфсхалеюн, дзе пройдзе конкурс, 3 мая — другая рэпетыцыя і прэс-канферэнцыя для прадстаўнікоў міжнародных СМІ.

ПРОСТАЯ МОВА

— Каб добра выступіць на «Еўрабачанні», не патрэбна мільёнаў долараў! Галоўнае, каб песня і нумар былі зроблены прафесійна, якасна і з густам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

«Прамая лінія»

Да ўвагі паляўнічых і рыбаловаў!

26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя правілаў вядзення палявання і рыбалоўства. Якія дакументы патрэбны, каб займацца такімі папулярнымі відамі рыбалкі, як тролінг і падводнае паляванне? Якія перавагі дае членства ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Іванавіч ШУМСКІ.** Задаць пытанні можна **22 красавіка з 12.00 да 13.00 гадзін** па тэлефонах: **80172871866, 80172871871.** Папярэднія пытанні можна пакінуць, патэлефанаваўшы па нумары **80172871872**.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.04.2014	на 01.04.2013
1	2	3	5	6
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	577 670.5	389 427.6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	11 597.5	12 414.6
4	Средства в Национальном банке	1103	760 949.3	1 281 720.9
5	Средства в банках	1104	1 006 365.4	1 297 744.7
6	Ценные бумаги	1105	2 237 437.1	1 462 828.2
7	Кредиты клиентам	1106	14 660 320.4	12 205 410.1
8	Производные финансовые активы	1107	-	194.6
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	29 785.9	29 785.9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	1 101 733.1	747 717.2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	6 179.5	-
12	Прочие активы	1111	177 857.4	193 918.7
13	ИТОГО активы	11	20 569 896.1	17 621 162.5
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	78.7	364 557.7
16	Средства банков	1202	10 153 465.2	8 363 561.2
17	Средства клиентов	1203	6 956 134.6	5 753 857.8
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	90 361.6	391 465.7
19	Производные финансовые обязательства	1205	7.4	606.5
20	Прочие обязательства	1206	327 803.2	229 751.2
21	ВСЕГО обязательства	120	17 527 850.7	15 103 800.1
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	1 174 075.0	1 174 075.0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	369 717.4	245 426.6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	594 969.0	464 129.9
27	Накопленная прибыль	1215	903 284.0	633 730.9
28	ВСЕГО капитал	121	3 042 045.4	2 517 362.4
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	20 569 896.1	17 621 162.5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 3 месяца 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	за 3 месяца 2014 года	за 3 месяца 2013 года
1	2	3	5	6
1	Процентные доходы	2011	577 080.4	458 717.9
2	Процентные расходы	2012	251 014.1	241 884.6
3	Чистые процентные доходы	201	326 066.3	216 833.3
4	Комиссионные доходы	2021	153 110.3	113 831.5
5	Комиссионные расходы	2022	77 581.2	28 412.4
6	Чистые комиссионные доходы	202	75 529.1	85 419.1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	935.7	121.9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	1 264.8	23 139.7
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	23 717.2	23 842.2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(3 062.5)	(11 183.0)
11	Чистые отчисления в резервы	207	98 587.2	65 766.8
12	Прочие доходы	208	9 917.6	2 910.5
13	Операционные расходы	209	175 947.5	126 519.7
14	Прочие расходы	210	10 925.6	23 580.0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	148 907.9	125 217.2
16	Налог на прибыль	212	25 996.4	23 189.4
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	122 911.5	102 027.8

Председатель Правления П.В. Каллаур

Главный бухгалтер Л.А. Филиппова

Дата подписания 7 апреля 2014 года

Отчетность размещена на сайте **www.belveb.by** в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2014 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.

ШЧАСЛІВАЯ МАРЫЯ...

Нягледзячы на ўсе выпрабаванні лёсу, Марыя Цімінская застаецца аптымісткай, складае вершы і шануе кожную хвіліну жыцця

…Аднойчы ёй прысніўся сон. Ідзе яна па бясконца доўгай дарозе і раптам разумее: гэта ж яе родная Вялікая Гарожа, якую 70 гадоў таму спалілі немцы. Але адкуль гэты храм? Памяць не захавала аб ім ніякіх успамінаў. Вялікі і магутны, у промнях заходзячага сонца, ён ззяе, як цудоўны палац. Ногі самі вядуць да яго. На ўваходзе сустракае святар, твар яго нібы свеціцца. «Праходзь, даражэнькая,— ветліва запрашае ён.— Тут ёсць і твае бацькі…»

Бацькоў Марыі Цімінскай падчас вайны забілі немцы. Як і амаль усіх астатніх жыхароў асіповіцкай вёскі Вялікая Гарожа. У Асіповіцкім раёне такі лёс напаткаў больш за 3,8 тысячы чалавек. Было спалена 50 вёсак, з іх цалкам — 12. З жывых сведак, якім пашчасціла вырвацца з таго пекла, амаль нікога не засталося. Марыя Цімінская, напэўна, адзіная. Да вёскі Дзераўцы, дзе яна жыве, каля 12 кіламетраў, і каб гэта сустрэча адбылася, Асіповіцкі райвыканкам нават выдзеліў карэспандэнту «Звязды» службовы аўтамабіль…

Вось і дом яе каля калодзежа. Марыя Паўлаўна з раніцы як след пратапіла грубку… На вочы трапляе фотаздымак, дзе зусім яшчэ маладыя хлопец і дзяўчына прытуліліся адно да аднаго. «Гэта мае бацькі…» — сумна кажа Марыя Цімінская.

ЦЯЖКАЕ РАЗВІТАННЕ

Той жахлівы дзень, калі немцы вынеслі смяротны прысуд жыхарам асіповіцкай вёскі Вялікая Гарожа, Марыя Цімінская запомніла назаўсёды.

— Гэта было 14 студзеня 1943 года,— вяртаецца яна ў сваё апаленае вайной дзяцінства.— Мы толькі паснедалі, маці прыбірала са стала. Я збіралася бегчы да сябровак. Нават паспела апрануцца і нацягнуць буркі. Раптам з вуліцы пачуліся стрэлы. Здавалася, нехта біў па вокнах. Бацька скамандаваў легчы на падлогу, а сам сабраўся паглядзець, што адбываецца. Але не паспеў выйсці за дзверы, як адразу ж вярнуўся. За ім у хату ўвайшлі два немцы з аўтаматамі…

Прыпеўкі прынеслі Цімінскай сапраўдную славу. Пасля «Звязды» (у сталіцу яе запрасілі на падвядзенне вынікаў) яна з імі шмат дзе пабывала, нават народны строй пашыла, каб было ў чым выступаць.

Потым усё было як у страшным сне. Аўтаматчыкі загадалі ўсім выйсці на вуліцу, і маленькая Марыйка першая выбегла з дому. Яна амаль дайшла да брамкі, калі раптоўна пачула за спінай стрэлы. Аўтаматная чарга нібы скасіла ўсю яе сям'ю. Бялюткі снег зачырванеў крывёю. У шоку дзяўчынка кінулася на вуліцу. Адусюль чуліся стрэлы і крыкі. Заскочыла ў двор да суседзяў, але ўбачыла, што там таксама ляжаць забітыя. Разгубленая, яна не ведала, куды бегчы. Ногі самі панеслі ў бок агародаў. Адтуль яна вярнулася да свайго двара і забілася ў хляўчук. Колькі сядзела там — не памятае. Выйсці адважылася толькі тады, калі змоўклі стрэлы.

Тата, маці, бабуля, маленькая сястрычка Анютка, якой не было і 2 годзікаў, — немцы нікога не пашкадавалі. З сям'і Альфяровічаў засталася толькі яна, 5-гадовая Маня. Вёска ж быццам уся вымерла…

Знясіленую дзяўчынку перахапіла старая Макарыха, калі тая бегла па вуліцы, не ведаючы куды. Яна і прывяла дзяўчынку да калгаснай канторы, дзе сабраліся 11 чалавек, якія выратаваліся… За 5 кіламетраў ад Вялікай Гарожы ў вёсцы Акцябр жыў Манін дзядзька. Там жа знаходзілася і цётка 8-гадовага Мішы Патапейкі, які таксама выжыў. Суправаджаць іх туды не было каму, дзеці ішлі адны. З хаты дзяўчынка паспела забраць толькі ляльку, адэкалон і некалькі фотакартак з роднымі. Шукала яшчэ крыжык на чырвонай стужцы, які ёй некалькі разоў паказвала бабуля, але знайсці яго не змагла…

Марыя Цімінская трымае адну з любімых работ — «Фея зямлі».

ПАД АДНЫМ КРЫЖАМ

— У творы Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі…» пра Вялікую Гарожу ёсць асобная глава. Там дзеліцца ўспамінамі і мой дзядзька з далёкай радні,— кажа Марыя Цімінская.— Яе ў нас багата было. Раней на вёсцы маладыя між сабой жаніліся, таму амаль усе былі сваякамі. У адной магіле з маімі бацькамі ляжаць 42 чалавекі — і ўсе мая радня.

Хаваць загінулых немцы дазволілі толькі праз некалькі дзён. Па ўспамінах відавочцаў, целы людзей так здзервянелі, што іх прыходзілася высякаць. Гэтыя ледзяныя глыбы грузілі на вазы і везлі на могілкі, дзе мужчыны амаль да вечара капалі вялізныя ямы… Нехта хаваў сваіх блізкіх у скрынях, але ў асноўным іх складвалі штабелямі і накрывалі чым-небудзь… А праз некалькі дзён у вёсцы не стала і хат: немцы спалілі ўсё падчыстую.

— Не ведаю, ці праўда гэта, але чытала, што ў нас лютавалі забойцы дырлевангераўскай спецкаманды, якія потым і Хатынь сцерлі з твару зямлі,— кажа Марыя Паўлаўна.— Гарожа была спалена ў студзені, а Хатынь — у сакавіку.

Дарэчы, Марыю Цімінскую таксама ледзь не «пахавалі». Калі складалася раённая хранікальна-дакументальная кніга «Памяць», яе імя трапіла ў жалобны спіс. Добра яшчэ, што непаразуменне высветлілася да таго, як выданне аддалі ў друк. Блытаніна адбылася і з прозвішчамі бацькоў. У вёсцы сям'я мела мянушку Музычэнкі — дзед Сцяпан па бацькавай лініі добра іграў на цымбалах, скрыпцы, гармоніку. Вось мянушку спачатку і ўпісалі замест прозвішча. Але ж у апошні момант паспелі выправіць.

ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

У дзядзькі Марыя пражыла нядоўга. Пачаўся голад, і яе адправілі ў дзіцячы дом. Дарэчы, размяшчаўся ён у памяшканнях былой панскай сядзібы ў Свіслачы, недалёка ад Асіповічаў. Ежы там таксама не хапала, але ж тройчы ў дзень худа-бедна кармілі.

У дэфіцыце была не толькі ежа, але і паліва. Нават чарніла замярзала на ўроках. Але для дзяўчынкі з Вялікай Гарожы магчымасць вучыцца была вялікім шчасцем. Яна не чытала — праглынала кнігі. Памятае, як яе ўразіла бібліятэка дзіцячага дома. Якіх толькі кніг там ні было! Бібліятэкар быў не менш здзіўлены, калі маленькая дзяўчынка прачытала прапанаваную ім кніжку… за некалькі хвілін. Казка, праўда, была невялікая, але ён яшчэ ніколі не бачыў такіх спрытных чытачоў.

Марыя не магла надзівіцца на тыя сшыткі, што ім выдалі. Яны таксама былі сапраўдныя. Калі яна жыла ў дзядзькі і хадзіла ў першы клас, іх майстравалі з падручнага матэрыялу — газет, абгортачнай паперы. А тут — такое багацце! Нават памылку ў ім зрабіць яна лічыла злачынствам. Адзінай адзнакай па ўсіх прадметах была «5». Потым Марыя і інстытут скончыла з чырвоным дыпломам.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Вялікая Гарожа пасля вайны зноў адрадзілася. Па некаторых звестках, у трэці раз.

А свая хата з'вілася ў Марыі Паўлаўны ў 1968 годзе. Але не ў Гарожы, а ў суседняй вёсцы Дзераўцы, дзе яна працавала настаўніцай. Цяпер гэта яе «лецішча», дзе яна эксперыментуе з кветкамі. У 1990-я гады нават выпісвала з Прыбалтыкі крокусы, нарцысы, цюльпаны… Якіх толькі кветак ў яе ні было: прымулы, ружы, гіяцынты, гартэнзіі… Сабе хапала і з суседзямі дзялілася гэтай прыгажосцю. Сёння ўзрост і балячкі перашкаджаюць займацца любімай справай. Добра, што ёсць памочніца — дачка Алена. А вось сыны жывуць далёка: адзін — у Краснаярску, другі — у Самары. Для іх за шчасце сабрацца разам у бацькоўскай хаце. Але ж такое, на жаль, бывае рэдка.

Тата, маці, бабуля, маленькая сястрычка Анютка, якой не было і 2 годзікаў, — немцы нікога не пашкадавалі.

Шмат кветак і на вышыванках Марыі Цімінскай. Гэтай справе яна навучылася яшчэ ў дзіцячым доме. Але раней часу не было займацца. Затое на пенсіі адвяла душу. Майстрыха яна і насамрэч выдатная. Вока не адвесці ад «Феі зямлі» — асабліва, калі сонейка зіхаціць на расшытай бісерам сукенцы. Жывымі здаюцца і сініца на галінцы з мерзлымі яблыкамі, і пралескі, і ружы. Быццам бы яны ўвабралі ў сябе частку светлай душы сваёй стваральніцы.

Гэта ўсё, што засталося Марыі Цімінскай у спадчыну з даваеннага жыцця.

ГАЗЕТНЫ РАМАН

— А гэта «плён» майго супрацоўніцтва з газетай «Звязда».— Марыя Паўлаўна нечакана кладзе на стол некалькі важкіх альбомаў. Амаль усіх журналістаў выдання яна ведае па імёнах, і нават дні нараджэння некаторых.— Вось гэты фаліянт «Жыве фальклор» — сапраўдны рарытэт. Тут сабраны прыпеўкі за ўвесь 1994 год, пакуль ішоў ваш конкурс. І мае таксама. Я нават сабе сябра дзякуючы гэтаму конкурсу знайшла — пастаўскага паэта Аркадзя Нафрановіча.

Прыпеўкі прынеслі Цімінскай сапраўдную славу. Пасля «Звязды» (у сталіцу яе запрасілі на падвядзенне вынікаў) яна з імі шмат дзе пабывала, нават народны строй пашыла, каб было ў чым выступаць. У Паставах на міжнародным фестывалі заняла другое месца, стала лаўрэатам Асіповіцкага раённага конкурсу «Вясновыя колеры». А ў 2005 годзе выйшаў яе зборнік «На струнах маёй душы», дзе разам з кранальнымі вершамі аб Вялікай Гарожы знайшлося месца і вясёлым прыпеўкам. Творчасць Марыі Цімінскай зацікавіла нават вядомага беларускага кампазітара Мікалая Пятрэнку (аўтара музыкі да песні «У суботу Янка ехаў ля ракі»). Падчас сустрэчы ў Паставах ён прапанаваў ёй супрацоўніцтва, хацеў напісаць музыку да яе вершаў. Але не паспеў — сёлета 3 студзеня яго не стала.

— І ўсё ж такі адна песня на мой верш «Зямля мая» ёсць,— аптымістычна кажа Марыя Цімінская.— Музыку да яго напісаў наш асіповіцкі кампазітар Віктар Шышкавец, таксама вельмі таленавіты. Так што я — шчаслівая жанчына.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

Наименование банка:

Открытое акционерное общество
«Белорусский народный банк»

Место нахождения Банка:
220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2014	01.04.2013
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	102 480,1	41 842,5
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	470 927,5	398 807,6
5	Средства в банках	1104	67 231,7	58 274,4
6	Ценные бумаги	1105	-	-
7	Кредиты клиентам	1106	1 077 601,1	625 233,1
8	Производные финансовые активы	1107	-	151,0
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	77,8	77,8
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	114 433,1	85 165,0
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	8 374,4	2 986,5
12	Прочие активы	1111	16 026,5	8 837,0
13	ИТОГО активы	11	1 857 152,2	1 221 374,9
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	102 537,6	101 359,5
16	Средства банков	1202	451 297,9	244 523,2
17	Средства клиентов	1203	831 811,2	526 531,3
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	5 144,4	-
19	Производные финансовые обязательства	1205	134 778,5	111 951,0
20	Прочие обязательства	1206	14 789,1	8 219,2
21	ВСЕГО обязательства	120	1 540 358,7	992 584,2
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	69 219,7	69 219,7
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	44 277,5	44 277,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	97 739,7	81 578,0
27	Накопленная прибыль	1215	105 556,6	33 715,5
28	ВСЕГО капитал	121	316 793,5	228 790,7
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	1 857 152,2	1 221 374,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2014	01.04.2013
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	50 083,2	30 603,5
2	Процентные расходы	2012	21 298,2	11 374,3
3	Чистые процентные доходы	201	28 785,0	19 229,2
4	Комиссионные доходы	2021	14 589,3	8 366,0
5	Комиссионные расходы	2022	2 760,5	1 381,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	11 828,8	6 984,6
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	9 885,7	4 413,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(7 202,5)	(1 778,7)
11	Чистые отчисления в резервы	207	(1 193,5)	4 134,4
12	Прочие доходы	208	10 168,3	239,9
13	Операционные расходы	209	27 138,1	14 197,2
14	Прочие расходы	210	901,8	1 555,7
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	26 618,9	9 201,2
16	Налог на прибыль	212	4 864,8	1 728,6
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	21 754,1	7 472,6

Генеральный директор К. Церетели

Главный бухгалтер О.В. Глазырина

Дата подписания «08» апреля 2014 г.

Данная отчетность размещена
на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
(http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnostj/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html)

ОАО «БНБ-Банк». Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 07 июня 2013 г. УНП 100513485.

Сямейная газета

Выпуск № 6 (10)

КРЫНІЧКА НАТХНЕННЯ

Бадай кожнаму чалавеку, хто больш ці менш звязаны з творчасцю, знаёма гэта страшнае слова. Не, не дэдлайн. А ступар. Стан поўнай творчай бездапаможнасці, калі, што называецца, гляджу ў кнігу — бачу... Не пішацца, не малюецца, не прыдумляецца — перад унутраным позіркам толькі белая прасціна памерам з пустыню Сахара.

Кожны змагаецца з гэтай навалай па-свойму: хто працягвае працу цераз «не магу», хто пераключаецца на іншыя справы ў чаканні, пакуль у музы прачнуцца сумленне і імпэт. Асабіста я ў такія моманты стараюся падслухаць або ўзгадаць, аб чым гавораць дзеці.

Яшчэ ў падлеткавым узросце я зачытала «Ад двух да пяці» Чукоўскага да дзірак, як безадмоўны антыдэпрэсант. Але толькі калі сама стала мамай, пераканалася, што дзіцячыя «перлы» — гэта такая невычэрпная крыніца натхнення! Бо малыя, нават не ведаючы, што такое крэатыў, папросту з ім жывуць. Мы развучыліся рабіць глупствы, а яны — не. Таксама, як не развучыліся здзіўляцца, рабіць адкрыцці, бачыць новае ў звыклым і бачыць рэчы з самых неверагодных бакоў.

— Мама, глядзі, — аўтобус! Жоўценькі, як банан. Мама, гэта банан на колах! — выдае дачка па дарозе ў садок. І я, прыехаўшы на працу, міжволі ўсміхаючыся, калі прыгадваю гэты вобраз, амаль незаўважна для сябе на адным дыханні «выдаю» некалькі тэкстаў.

Прыгледзьцеся: толькі дзеці ўмеюць убачыць у начной кашулі ўбор прынцэсы, у бліскучым фанціку — кавалачак зоркі, а ў лужыне — каляровыя аблокі. Толькі яны пашкадуюць карпаў, бо тыя «могуць утапіцца» ў магазінным акварыуме, і зладзяць аперацыю па выратаванні дажджавога чарвяка, бо «на тым баку сцяжынкі яго чакаюць мама і тата». Толькі яны малююць кранальныя чырвоныя елкі з блакітным камлём, сябруюць з героямі мультфільмаў і даюць імёны незнаёмым коцікам. Толькі яны... Ды ўзгадайце самі, як многа ўмеюць толькі дзеці!

І, напэўна, толькі ў тых дарослых, хто здолеў захаваць у сабе гэтае «ўнутранае дзіця» і не развучыўся здзіўляцца навакольнаму свету, атрымліваецца прыдумаць «Аранжавую песню», «Казку пра залаты ключык» ці «Маленькага прынца». Хіба не?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

МАМА — МОЙ ЧЭМПІЁН!

У сталіцы прайшоў першы гарадскі конкурс «СуперМама», зладжаны святочным агенцтвам Ларысы Грыбалёвай пры падтрымцы Мінгарвыканкама. Удзел у гэтым своеасаблівым спаборніцтве жадалі ўзяць больш за 30, а ў фінал прайшлі 10 жанчын, кожная з якіх мала таго што дасягнула значных поспехаў у кар'еры ці бізнесе, але яшчэ нарадзіла і выхоўвае ад 3 да 6 дзяцей.

Мінчанкі, якія прэтэндавалі на званне «супермамы», рэалізаваліся ў самых розных кірунках: судовы выканаўца, дацэнт і выкладчык БДУ, дырэктар салона вясельнай і вячэрняй моды, сузаснавальніца сеткі кавярняў, уладальніца жаночага фітнес-клуба, намеснік начальніка выпрабавальнай лабараторыі, фінансавы кіраўнік бізнес-цэнтра...

Усе мамы на розных этапах конкурсу вучыліся планаваць сямейны бюджэт, дэманстравалі свае кулінарныя здольнасці, удзельнічалі ў фотасесіі. У фінале ж яны павінны былі зрабіць прэзентацыю пра асабістыя дасягненні і прафесійны рост, прайсці інтэлектуальны тэст, а таксама праявіць сябе ў творчым конкурсе і паўдзельнічаць у дэфіле. Лепш за ўсіх гэтыя выпрабаванні ўдалося прайсці сузаснавальніцы школы добрага густу Le Gourmet, маме траіх дзяцей Алене Мірончык: суддзі высока ацанілі як прыгатаваны ёй торт, так і выкананую ёй кранальную песню, прысвечаную маме. У якасці галоўнага прыза пераможца атрымала карону з каштоўнымі камянямі. Наогул жа без падарункаў не засталася ніводная з канкурсантак.

Паводле слоў арганізатара мераприемства, спявачкі і тэлевядучай Ларысы Грыбалёвай, галоўнай мэтай для сябе яна бачыла паказаць навакольным, наколькі шчаслівай робіць жанчыну вялікая сям'я, пераадолець стэрэатып, які склаўся ў грамадстве, быццам шматдзетная сям'я — сям'я праблемная.

— Мы вырашылі паказаць актыўных, паспяховых, прыгожых мам, якія маюць шмат дзяцей і ўсё паспяваюць. Бо дзеці — гэта натхненне. Натуральна, мы не пераканаем тых, хто мае прынцыпова іншую пазіцыю, але, безумоўна, зможам змяніць стаўленне тых, хто сумняваецца, — рэзюмавала спявачка, якая, між іншым, і сама паспяхова сумяшчае творчасць, бізнес і выхаванне дваіх дзяцей.

Дзеці першымі павіншавалі маму з перамогай.

У наступным годзе, як плануюць арганізатары, «СуперМама» выйдзе на рэспубліканскі ўзровень, а магчымасць праявіць сябе атрымаюць таксама актыўныя і паспяховыя бабулі і вялікія творчыя сем'і. Сёлета ж пройдзе другі рэспубліканскі конкурс «Сям'я года», а напярэдадні Дня сям'і ў Мінску будзе названа лепшая шматдзетная сям'я горада.

Дарэчы, паводле звестак Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама, цяпер у сталіцы пражывае амаль 9 тысяч (8791) шматдзетных сем'яў. Тры чвэрці з іх, адзначыла намеснік старшыні камітэта Ірына Дудка, выхоўваюць па трое дзяцей; але ёсць і тыя, у каго растуць пяцёра, сямёра, а ў дзвюх мінскіх сем'ях — па 12 дзетак! Ордэнам Маці (яго атрымліваюць жанчыны, якія нарадзілі і годна выхавалі 5 і больш дзяцей) узнагароджана 471 мінчанка, а сёлета гэтая лічба павялічыцца яшчэ на 12 чалавек.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Кацярына ЕЛІЗАРАВА супраць «дрэннага надвор'я» ў хаце.

Сям'я заўсёды выратуе ад бяды — даказала Вольга ЦІМКІНА.

Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Заслужаны артыст Беларусі Барыс БАРЫСЁНАК:

«ЗА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ ЖОНКА НІВОДНАГА БРЫДКАГА СЛОВА НЕ СКАЗАЛА!»

Ёсць сямейныя пары, ад якіх немагчыма адвесці вачэй. І не таму, што яны па-галівудску прыгожыя, а з той прычыны, што іх ахутвае амаль бачная аўра пяшчоты і цеплыні па-сапраўднаму блізкіх людзей... Барыс Васільевіч і Тамара Сцяпанаўна Барысёнкі менавіта з такіх пар. Яны разам ужо больш чым 50 гадоў, але дагэтуль называюць адно аднаго ласкавымі імёнамі. Яны спалучаюць тактоўнасць і пачуццё гумару. Магчыма, таму гутарыць з сям'ёй, у якой два заслужаныя артысты (Барыс Васільевіч і дачка, Алена Спірыдовіч), атрымліваецца бясконца цікава, проста і адкрыта, як з добрымі сябрамі.

Старыя фатаграфіі сям'і Барысёнкаў — быццам кадры з фільма, а самі яны падобныя да кіназорак.

«Мама была супраць шлюбу, і я крадком забрала пашпарт»

Пазнаёміліся нашы героі на тэлебачанні: Барыс Барысёнак пэўны час быў дыктарам, таксама чытаў вершы, а зусім яшчэ юная Тамара пасля 10 класаў прыйшла працаваць у дзіцячую рэдакцыю.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

■ Яшчэ раз пра любоў

ПРЫРУЧЫЦЬ ЛІСЯНЯ,

або Мая малодшая дачка

Надзея, радасць, хваляванне, боль, адчай і... любоў. Аб праблеме любові і нелюбові да дзяцей «Звяздзе» ўжо расказвалі псіхолаг і святар. На гэты раз — аповед жанчыны, якая ўдачарыла дзяўчынку. Яна думала, што палюбіць дзіця лёгка. І на ўласным вопыце ўпэўнілася ў адваротным.

Рашэнне ў канцы лютага

Жанчына: «Пра тое, што возьмем дзіця з дзіцячага дома, мы з мужам заўсёды ведалі. Не абгавораны быў толькі час, калі мы зробім гэты крок. І вось нашы двое дзетак падраслі: дачка пайшла ў школу, сын год ужо хадзіў у сад. Тады мы зноў сталі гаварыць пра ўсынаўленне. Чаго цягнуць? Раней дзеці былі малыя, а потым мы ўжо будзем старыя. Можна прыдумаць шмат прычын, з-за якіх мы так і не возьмем дзіця. А цяпер ёсць сілы і жаданне».

Дзяўчынка: «Мяне старэйшая сястра заўсёды палохала дзіцячым домам. Яна гаварыла, што гэта турма, толькі для дзяцей. І я ёй верыла. Не хачу ў турму! Буду рабіць усё, каб ніхто і не здагадаўся, што мае бацькі п'яніцы. Нікому не буду скардзіцца, не скажу, што галодная. Як тады не сказала маці, што мне вельмі холадна і я не адчуваю ні рук, ні ног... Стаяла з ёю на вакзале некалькі гадзін. Яна прадавала крадзенае піва, але першую выручку адразу ж прапіла, калі я пайшла пагрэцца на паўгадзіны ў метро. Нельга было пакідаць яе адну, нават, калі б я ўпала ад марозу. Малыя браты суткі амаль нічога не елі, трэба было што-небудзь ім прынесці»...

Першая сустрэча

Жанчына: «Я вельмі хвалявалася. Мы з мужам яшчэ не закончылі курсы для будучых усынавіцеляў, але нам прапанавалі пазнаёміцца з адной дзяўчынкай з дома малютак. Гэта не значыць, што трэба ўзяць менавіта яе — проста паглядзець, а потым ужо вырашаць...

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

ПРЫРУЧЫЦЬ ЛІСЯНЯ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Каля дзвярэй у групу я зноў пакрыўдзілася на мужа, які адмовіўся са мной ехаць. Ён увогуле не мог уявіць сабе, як гэта — выбіраць дзіця... Дачку і сына мы не выбіралі — якія нарадзілася, тыя і нашы. І ў гэтым выпадку ён вырашыў, што выбіраць не будзе: каго прапануюць, таго і возьмем. Мне ж самой хацелася, каб гэта была дзяўчынка і ў яе былі карыя вочкі і светлыя валасы. Разам мы вырашылі толькі, што дзіцяці будзе не больш чым паўтара года.

Я стаяла на парозе і глядзела на пусты пакой з цацкамі. У грудзях грукатала. Дзверы спальні адчыніліся, і нянечка ўнесла маленькую заспаную дзяўчынку.

— Можа, возьмеце яе на рукі? — спытала мяне выхавацелька.

Мы сустрэліся з малой позіркамі, і дзяўчынка гучна заплакала.

— Не трэба, — адказала я.

Маё сэрца ўжо супакоілася. Яно не «ёкнула», калі я ўбачыла малую. Я заўважыла, што ў яе непрапарцыянальна вялікія шчокі. Яна не была прыгажуняй...

Дзіўна, што першая дзяўчынка, якую нам прапанавалі, была менавіта са светлымі валасамі і карымі вочкамі... Але мае пачуцці маўчалі. Я не адчувала ні радасці, ні смутку, ні сімпатыі, ні антыпатыі... Проста недзе вельмі глыбока ведала, што дзіця — маё».

Дзяўчынка: «Нядаўна прыехала мая старэйшая сястра з радзільні. Я хвалявалася. Было вельмі цікава паглядзець на маленькага пляменніка. Я бачыла немаўлят, але гэта былі мае браты...

Маці з татам усё часцей сыходзяць з дому на некалькі дзён, а мне цяжка самой знайсці якую-небудзь ежу. Чаму ў нас усё так? Раней было добра. Я хадзіла ў дзіцячы садок з малодшым братам, мы не любілі зялёны гарошак і сасіскі, затое вельмі любілі мандарыны, Новы год і Дзеда Мароза, які прыносіў шмат цацак. Што стала з маімі бацькамі? Іх ужо не цікавіць, дзе мы і што ядзім. А раней за прагул у школе та-

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

та моцна лупіў сястру. Ён увогуле ўсіх б'е, але толькі калі нап'ецца. Цяпер ён кожны дзень п'яны.

Маці таксама выпісваюць з радзільні. Цяпер у мяне будзе чатыры малодшыя браты і маленькі пляменнік. Брата назвалі Дзіма, а пляменніка — Аляксандр. Калі сястра паказала мне Сашку, я адразу яго палюбіла. Ён смачна пах малаком і чысцінёй...»

Міліцыя

Жанчына: «Я яшчэ ніяк не магла ўсвядоміць, што ў нас ужо пяты дзень жыве Ангеліна. Яна амаль не звяртае на нас увагі. Скажу «хадзем есці» — ідзе, «спаць» — ідзе, «на гаршчок» — ідзе. На падрыхтоўчых курсах сказалі, што любоў прыйдзе праз некаторы час, калі мы з дзіцем станем блізкімі. А пакуль я толькі назірала за ёй, каб даведацца, якая яна — мая малеча.

Праз пару месяцаў істэрыкі пачалі адбывацца значна радзей. Не скажу, што гэта мяне радавала, я ўжо не спадзявалася на нашу ўзаемную любоў, хацелася толькі аднаго — мірна суіснаваць.

У той дзень увечары ўсё ішло як звычайна. Сын быў у дзіцячым садку. Дачка толькі прыйшла са школы. Я з Ангелінай павячэрала і прапанавала ёй «пайсці на гаршчок». Але малая заматала галавой. Тады я ўсміхнулася, узяла яе за руку і павяла да прыбіральні. Калі ўключыла святло і адчыніла дзверы, Ангеліна раптоўна ўпала на падлогу і закрычала. Не заплакала, а менавіта закрычала. Я паспрабавала ўзяць яе на рукі і супакоіць, але малая стала біць, кусаць мяне і брыкацца. Праз некалькі хвілін у кватэру пазваніла суседка.

— Чаго ў вас дзіця так крычыць?

— Прабачце нас, калі ласка, — паспрабавала апраўдацца я. — У дзіцяці, напэўна, пачалася адаптацыя да нашай сям'і, мы забралі яе з дзіцячага дома...

— Сваіх нармальна выхаваць не можа, а чужое ўзяла! Я зараз міліцыю выклічу!

— Выклікайце! — адказала я і рэзка зачыніла дзверы.

У кватэры па-ранейшаму стаяў невыносны крык. Ангеліна, ужо бардовая ад плачу, ляжала на падлозе. Я села побач з ёй і... таксама разрыдалася.

Праз дваццаць хвілін мы абедзве супакоіліся. Малая гуляла з цацкамі, а я глядзела на яе і дзівілася... У мяне рукі трэсліся, а яна бегала, скакала, быццам бы не было гэтых 40 хвілін пекла.

Якраз тады і прыйшоў участковы. «Вось гэтае дзіця нарабіла столькі шуму?» — з цікаўнасцю разглядаючы Ангеліну, спытаў ён. І, сказаўшы некалькі слоў падтрымкі, пайшоў.

Дзяўчынка: «Мае бацькі не любілі і баяліся міліцыю. Гэтая непрыязнасць перадалася і нам, дзецям. Хаця да таго дня, асабіста я ніколі з ёй не сутыкалася. Жыццё ў апошнія пару месяцаў увогуле было невыносным. Я часта заставалася адна з дваімі немаўлятамі. Брат амаль не плакаў і не прасіў есці. А Сашка, пляменнік, захліпваўся ў рыданнях, ён увесь час хацеў малака!

У той вечар мне здавалася, што я хачу толькі спаць. Я была рада прыходу бацькоў: хай маці калыша і супакойвае Сашку. Але яна не калыхала, яна была такой, як заўсёды ў апошні час...

Раніцай я доўга ляжала ў ложку, накрыўшыся паліто з галавой. Не спала, проста не магла прымусіць сябе падысці да немаўлятак, бо ведала, што маленькі Сашка перастаў плакаць яшчэ ноччу. Ад гэтага было страшна. Нарэшце маці ўстала, падышла да малога і... закрычала.

Тады разам з міліцыяй прыйшлі нейкія жанчыны. Было непрыемна, што чужыя людзі ходзяць па нашай кватэры, гучна гавораць і нешта абмяркоўваюць. Двое маіх братоў, пяцігадовы і трохгадовы, туліліся да мяне. Але я сама адчувала сябе безабароннай. Нованароджанага Дзімку забрала «хуткая». Міліцыянер падышоў да мяне і сказаў, што па нас таксама прыедуць.

Не ведаю, што будзе заўтра і якія ў нас будуць адносіны. Але са свайго боку зраблю ўсё, каб яна была шчаслівая.

Пасля пахавання Сашкі зноў прыехала міліцыя. Па нас. Першы раз у жыцці я бачыла, як тата плача».

Адчай і... надзея

Жанчына: «Праз паўгода ў мяне не засталося ні эмоцый, ні сіл. Толькі пустата. З Ангелінай здараліся істэрыкі па некалькі разоў на дзень, а таксама ноччу. Яна крычала без перапынку па 30-40 хвілін. Цяжэй за ўсё было ноччу, калі ёй сніўся дрэнны сон ці яна не хацела спаць. Яна пачынала крычаць і будзіла ўсіх.

Мне здавалася, яна адкрыта мяне не любіць. Яна не давала сябе суцяшаць, лашчыць, не любіла, калі я спрабавала яе абняць. Яна перастала хадзіць на гаршчок зусім, давялося карыстацца памперсамі. Самае жахлівае, што з ёю ніяк не ўдавалася наладзіць хаця б нейкі кантакт. На ўсе мае просьбы яна адказвала крыкам або ўцякала. Яна ламала і псавала ўсё, што траплялася ёй у рукі. На вуліцы яна магла пайсці да чужога чалавека, але толькі не да мяне. Было і такое, што мінакі пыталіся, ці маё гэта дзіця.

Я расслаблялася толькі, калі яна засынала. Тады яна выглядала слабай, маленькай і адзінокай. Я глядзела на яе і плакала: ад таго, што яна мяне не любіць, ад таго, што нічога не магу змяніць, ад таго, што ў мяне не было больш сіл змагацца за тое, каб мы былі блізкімі і роднымі людзьмі.

Я ўспамінала, як мяне з братамі забралі ад бацькоў. Мяне адправілі ў школу-інтэрнат, малых — у дзіцячы дом. Я вельмі пакутавала ад разлукі, часта плакала па начах, калі ніхто не чуў і не бачыў. Мы былі патрэбны толькі адно аднаму, а дарослыя, якія раптам з'яўляліся ў нашым жыцці, так жа хутка знікалі.

Магчыма, тады я зразумела, што няма нічога больш каштоўнага, чым любоў. Я спрачалася да хрыпаты з людзьмі, якія гаварылі пра тое, што дзеці з інтэрната «цяжкія», не здольныя любіць, што ўвогуле чужых дзяцей палюбіць складана.

...Цяпер, калі ў мяне з'явілася Ангеліна, я раптам зразумела, што тыя людзі, магчыма, мелі рацыю!

Нованароджанага Дзімку забрала «хуткая». Міліцыянер падышоў да мяне і сказаў, што па нас таксама прыедуць.

Змянілася ўсё ноччу. У Ангеліны паднялася тэмпература да 40°С. Я ўзяла яе на рукі, паклала да сябе і дала лекі. Яна не працівілася, як звычайна, а знясілена ляжала.

...Як толькі тэмпература спала, малая прачнулася і, убачыўшы мяне, стала плакаць. Потым, хістаючыся, папаўзла ў свой ложак. Я разрыдалася. Так немагчыма жыць!

У тую ноч я ўспомніла Маленькага прынца Экзюперы, які змог прыручыць лісяня. І вырашыла, што паспрабую. Бо на той момант мне здавалася, што Ангеліна можа памерці, а я даведаюся пра гэта толькі раніцай, як тады мая маці пра Сашу...

Не ведаю, адкуль узяліся сілы. Я рабіла ўсё, як і раней, толькі вырашыла больш рухацца да яе. Напрыклад, калі яна крычала мне «дзі», не сыходзіла. Ад гэтага істэрыкі станавіліся даўжэйшымі, але я ўсё роўна заставалася з ёю ў пакоі. Нягледзячы на яе злое «дзі», была побач, калі яна засынала. Кожную раніцу прымушала сябе падыходзіць да яе ложка і з усмешкай вітацца. Хоць не заўсёды нават хацелася ўставаць, бо напярадзе быў доўгі дзень цяжкай барацьбы. Часам я не вытрымлівала і сыходзіла, але на наступны дзень пачынала «прыручаць» яе зноў.

Праз пару месяцаў істэрыкі пачалі адбывацца значна радзей. Не скажу, што гэта мяне радавала, я ўжо не спадзявалася на нашу ўзаемную любоў, хацелася толькі аднаго — мірна суіснаваць.

Мінуў амаль год. Аднойчы ноччу я прачнулася ад нарастаючай унутранай трывогі. Устала і пайшла да Ангеліны — і раптам пачула яе ціхі голас. Яна звала мяне! Ціха, амаль шэптам: «Мама, мама...» Я кінулася да яе. Тэмпература! Дала лекі, і паклала да сябе. І яна заснула, а я — не... Мне было так радасна. Я раптам адчула, што вельмі люблю яе — бясконца, кожнай сваёй клетачкай! Усю і ўсякую...

Яна больш не ўцякае ад мяне. У яе амаль няма істэрык. Яны пачынаюцца толькі тады, калі яна хварэе, ці калі змяняецца звыклае асяроддзе. Я ўжо ўпэўнена гавару: «Мая малодшая дачка».

Не ведаю, што будзе заўтра і якія ў нас будуць адносіны. Але са свайго боку зраблю ўсё, каб яна была шчаслівая. Гэта не значыць, што змагу пазбегнуць памылак, якіх ужо шмат нарабіла ў час адаптацыі, але мне хочацца верыць, што добрага будзе больш.

Я дакладна ведаю ступень унутранай радасці, калі маленькі чалавечак пытаецца: «Мама, ты любіш мяне?». І, пачуўшы адказ, бяжыць далей з крыкам: «І я цябе, мама, любуууу!»

Запісала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ЦІ ПАТРЭБНА ДЗІЦЯЦІ ГІМНАЗІЯ?

Марына ЛЯВОШКА, хатняя гаспадыня:

— Сёлета мой сын будзе паступаць у гімназію. Мы нанялі рэпетытара, каб падрыхтаваць сына да ўступных іспытаў. На мой погляд, маё дзіця там атрымае больш якасную адукацыю. Звычайна ў гімназіі добра сфарміраваны калектыў настаўнікаў, які ўстаяўся, а гэта дапамагае стварыць неабходную спрыяльную атмасферу ў такой навучальнай установе.

Бацькі, якія рыхтуюць сваіх дзяцей да гімназіі, занепакоены іх будучыняй, таму дзеці там будуць больш матываваныя. Лічу, што ў выхаванні дзіцяці не апошнюю ролю адыгрывае асяроддзе. Але...

Я ведаю, што ў гімназіі вучыцца складана, таму не выключаю магчымасці таго, што зноў перавяду сына ў звычайную школу, калі раптам адчую, што для яго гэта становіцца цяжка. А пакуль паспрабуем паступіць і будзем назіраць.

Ігар БЕЗРУК, намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «ФаварытМаркет»:

— Я супраць таго, каб мой сын вучыўся ў гімназіі. Мне здаецца, што сістэма адукацыі ўвогуле выхоўвае не развіццё асобы, а падначаленне. І гімназія са сваёй асаблівай дысцыплінай выхоўвае выканаўцаў. Лепш развіваць таленты і здольнасці ў дзяцей. Для гэтага патрэбна, каб малое займалася тым, што яму падабаецца і што яно любіць.

У звычайнай школе менш залішняй нагрузкі на дзіця, і ў яго больш свабоднага часу для заняткаў у розных гуртках ці секцыях. Там малое, магчыма, раскрыецца і знойдзе сябе.

Ды я і сам вучыўся ў звычайнай школе, дзе было арганізавана шмат розных гурткоў і секцый. Я ўсюды сябе паспрабаваў і ўпэўніўся ў сваіх здольнасцях. Спадзяюся, што дапамагу сваім дзецям раскрыць сябе і без гімназіі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

«...ЖОНКА НІВОДНАГА БРЫДКАГА СЛОВА НЕ СКАЗАЛА!»

Яны ведаюць, як гэта — ісці поруч у горы і радасці. А мы шчыра жадаем, каб толькі ў радасці.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

«Такая прыгожанькая, маленькая, тоненькая — я адразу звярнуў увагу, — з усмешкай у вачах прызнаецца Барыс Васільевіч. — Запрасіў яе ў тэатр. Яна прыйшла ў чырвонай сукенцы з гальштучкам, ну, проста дзяўчо. А адзін акцёр, такі мажны, пажылы мужчына, кажа: «Барыс, ты што, няўжо табе дзяўчат не хапае — з піянеркай звязаўся?» Мая дарагая Тома потым, калі даведалася, так абуралася: «Я ўжо дарослая!»

Год маладыя людзі сустракаліся, прыглядаліся адно да аднаго, а потым вырашылі распісацца. Шлюб зарэгістравалі 12 красавіка. (Дарэчы, толькі праз год гэтая дата стала ўсім вядомым Днём касманаўтыкі, а тады ў маладых была зусім іншая нагода: менавіта ў такі ж дзень, але на год раней, блізкі сябар жаніха зладзіў уласнае вяселле).

— У ЗАГСе нам кажуць: «Вы дакладна добра падумалі? Пахадзіце яшчэ 2 гадзінкі». Мы і пайшлі... ва ўнівермаг. Тады ў майго сябра ўжо нарадзіўся сын, нам з ім далі кватэру на дзве сям'і, і мы, адстаяўшы вялікую чаргу, купілі ў падарунак малому хадункі. Прыйшлі зноў у ЗАГС з гэтымі хадункамі, і, відаць, супрацоўнікі вырашылі, што мы ўжо даўно пра ўсё падумалі, тут жа і заяву прынялі, і распісалі, — пад агульны рогат узгадвае Барыс Васільевіч.

Праўда, галоўнай перашкодай да атрымання штампа ў пашпарце ледзь не стала маці нявесты. Бацька дзяўчыны, які быў пагранічнікам, загінуў на фронце, і мама выхоўвала яе адна, прычым даволі строга. Пра вяселле і чуць не хацела: «Ты ж толькі школу скончыла, якая сям'я — рана!» З гэтага, распавядае Тамара Сцяпанаўна, атрымаўся суцэльны дэтэктыў:

— Каб я чаго не выкінула, мама схавала пашпарт у шафу і зачыніла на ключ. А паліца з дакументамі была закрыта гэткімі шклянымі планкамі. Я крадком дастала адзін кавалачак шкла — усе астатнія нахіліліся, тады ўжо выцягнула дакументы і ўзяла свой пашпарт... Потым з Борам прыехалі дадому, паставілі маму перад фактам: мы зарэгістраваліся. Мама — у слёзы. Але ўжо ўвечары прыйшла да нас на кватэру, усе разам сціпла адзначылі.

— Лічыцца, што ўсе дзяўчаты хочуць на вяселле апрануць прыгожую белую сукенку. Не было крыўдна, што яе не прымералі?

Т.С.: — Вячэрняя сукенка ў мяне насамрэч была. Мая мама, акрамя таго, што працавала ў «Звяздзе» стэнаграфісткай, добра шыла і такім чынам падпрацоўвала. Так што сшыла мне вельмі прыгожы выпускны ўбор з капрону, з шаўковым ніжнім Чахлом, які можна было насіць асобна. Але ў сам ЗАГС прыйшла з працы, у звычайнай сукенцы. Ды хіба ў ёй справа?

А з космасам у Барысёнкаў звязаны не толькі дзень нараджэння сям'і. У 1963 годзе на кіеўскай кінастудыі імя Даўжэнкі здымаўся фільм «Мары насустрач». І на адну з галоўных роляў касманаўта запрасілі Барыса Васільевіча.

Цыганка нагадала

— У 1956 годзе я скончыў інстытут і паехаў на першыя гастролі ў Гомель, — прыгадвае Барыс Васільевіч. — Пайшоў пагуляць у знакаміты парк Румянцавых-Паскевічаў. Раптам аднекуль з'явіліся цыгане. Адна прычапілася: маўляў, дай, пагадаю... А я быў вельмі сарамлівы, не здолеў адмовіцца. Яна атрымала рубель і завяла: маўляў, ты — артыст, будзеш папулярны, і ў цябе будзе дачка, таксама актрыса... А я і пра жаніцьбу яшчэ нічога не думаў, пасмяяўся ды пайшоў. І толькі праз шмат гадоў, калі Алене далі званне заслужанай артысткі Беларусі, прыгадаў той выпадак.

«Тата — паляўнічы, а мама — какетка»

Літаральна праз 10 дзён пасля першага палёту чалавека ў космас у сям'і нарадзілася жаданая і вельмі любімая бацькамі дачка Лена. Дакладней, гэта тады яна была проста Леначкай, а цяпер — заслужаная артыстка Беларусі Алена Спірыдовіч.

Калі я на штосьці пакрыўджуся, яна падыходзіць і кажа ласкава: «Бора, Бора...» Магчыма, гэта ўжо больш такія дзіцячыя гульні, чым сапраўдная крыўда, бо мы адно без аднаго не можам.

— Сваякі з абодвух бакоў вельмі любяць паспрачацца, на каго больш падобна дзіця. Вы самі як лічыце?

Б.В.: — Я перакананы, што на мяне. А Тома перакананая, што на яе. Так і не можам вызначыцца. У пакоі над ложкам з абодвух бакоў павесілі любімыя фотаздымкі дачкі, і я кажу: маўляў, гэта твая Алена, а гэта — мая...

— Псіхолагі сцвярджаюць, што адно дзіця ў сям'і звычайна расце капрызлівым, спешчаным. Але ўсе крыніцы сцвярджаюць, што Алена расла спакойнай і паслухмянай. Адкрыйце вялікую бацькоўскую таямніцу: як вам гэта ўдалося?

Т.С.: — Магчыма, так адбылося таму, што нам асабліва не было калі сюсюкаць і псаваць дачку празмерным клопатам. Пасля яе нараджэння я завочна паступіла ў інстытут на рэжысёрскі факультэт, паралельна працавала, рабіла кантрольныя, здавала сесіі... Натуральна, было цяжка, хоць і нянечка дапамагала.

Здымкі любімай дачкі Барыс Васільевіч і Тамара Сцяпанаўна захоўваюць на адмысловай «памятнай дошцы» — гэта намаляваныя ад рукі цітры, з якімі Алена Спірыдовіч вяла свой першы тэлемост з Масквой.

Б.В.: — Але асабліва скардзіцца не выпадае. Проста Лена з нараджэння была спакойнай і не крыклівай, і вельмі рана зрабілася самастойнай, як быццам разумела, што бацькі вельмі занятыя.

Бацька, хоць таксама быў загружаны (выкладаў у інстытуце, працаваў на радыё, у тэатры, здымаўся на тэлебачанні і ў кіно), але шмат займаўся дачкой. Яна часта ўзгадвае ў інтэрв'ю, што расла «дзіцем закулісся», перагледзела ўвесь рэпертуар Тэатра юнага гледача, нават ездзіла з татам на гастролі. А калі ў дзіцячым садку Алену спыталі, кім працуюць бацькі, яна выдала: «Мой тата — паляўнічы (гэта была адна з тэатральных роляў. — **Аўт**.), а мама — какетка!»

— На бацькоўскіх сходах у школе вам калі-небудзь даводзілася чырванець?

Т.С.: — Ніколі. Алена вельмі добра вучылася. Праўда, аднойчы, ужо ў старэйшай школе, яны ўсім класам збеглі з урокаў у кіно. А паколькі Алена была старастай і завадатарам у гэтай справе, то з яе найперш і спыталі. Класны кіраўнік у іх быў малады, разгубіўся: што рабіць? Кажу: «Ну, давайце па-даросламу, каб адчулі сваю адказнасць, збірайце агульны сход, выбірайце іншага старасту...» Але клас прагаласаваў за яе зноў.

— Барыс Васільевіч, а праўда, што гэта вы ўгаварылі дачку ісці ў журналістыку?

Б.В.: — Было такое. Хоць знаёмыя былі перакананы, што дачка пойдзе на акцёрскае... Мы з Ленай часта ездзілі разам на рыбалку: пакуль я пільную рыбу, яна кветачкі збірае, разглядвае наваколле. Аднойчы, класе ўжо ў сёмым ці восьмым, ім задалі сачыненне «Як я правёў лета». І Лена так яскрава апісала рыбацкую раніцу — узыход сонца, конікаў, першую расу — я чытаў і не мог адарвацца! Гэтае сачыненне потым пайшло на рэспубліканскі конкурс і атрымала прыз. І потым, калі абмяркоўвалі выбар прафесіі, я прыгадаў той выпадак і перакананаў Лену, што ў яе ёсць талент да прыгожага пісьменства. Праўда, яна адвучылася два гады на журфаку і выйшла замуж...

Тут гісторыя зрабіла спіральны віток. Як Барыс Васільевіч і Тамара Сцяпанаўна пажаніліся насуперак жаданню бацькоў, так і Алена абрала першага мужа, аднаго з пачынальнікаў беларускай рок-музыкі Уладзіміра Спірыдовіча, ні з кім асабліва не параіўшыся. Бацькі, праявіўшы мудрасць і цярпенне (хоць і перажывалі ўнутры: «Што яна ў ім знайшла?»), прынялі сітуацыю як ёсць. Мабыць, таму нават пасля разводу захавалі добрыя стасункі з былым зяцем, і ён да самай сваёй заўчаснай смерці часта тэлефанаваў Барысёнкам і распавядаў пра сваё жыццё.

— Які першы вялікі поспех дачкі для вас найбольш памятны?

Т.С.: — Напэўна, калі ёй даверылі весці «Славянскі базар у Віцебску». Потым у нас гэта зрабілася ўжо добрай традыцыяй: пачынаецца трансляцыя «Славянскага базару» — садзімся на канапу і ўважліва глядзім. А калі ёй званне заслужанай артысткі давалі (мы да апошняга нічога не ведалі), так перажывалі — Барысу нават дрэнна з сэрцам было...

Б.В.: — А мне яшчэ запомнілася, у дачкі была вельмі добрая перадача «Лідар», дзе яна збірала маладыя таленты і адкрыла мноства новых імёнаў. Адтуль і Вольга Вронская, і Іскуі Абалян, і шмат папулярных цяпер артыстаў. Наогул, усе хваляванні ў нас ужо не за ўласныя справы, а за Лену — за ўсё тое добрае і не вельмі, што ў яе адбываецца.

Падарунак для мамы

— Калі дачцэ далі званне заслужанай артысткі (гэта было позна ноччу на «Славянскім базары»), яна са сцэны сказала: «Сёння дзень нараджэння ў маёй мамы. Але я так закруцілася, што нават не паспела яе павіншаваць. Вы ёй такі падарунак зрабілі!» — і расплакалася. А мне потым да 4 гадзін раніцы тэлефанавалі аднакласнікі: «Аказваецца, у цябе сёння дзень нараджэння? Віншуем!» — успамінае Тамара Сцяпанаўна.

«Ты — мужчына, нясі адказнасць!»

— Не магу не спытаць у людзей, чый сямейны стаж нядаўна пераадолеў адзнаку ў 54 гады: як захаваць гэтае пачуццё любові, утульнасці і цеплыні праз доўгі час?

Б.В.: — Напэўна, павінна быць любоў і павага адно да аднаго. Нядаўна глядзелі тэлесюжэт пра футбаліста Аршавіна: трое дзяцей у іх з жонкай, і тут ён разводзіцца дзеля іншай жанчыны. Як гэта можна? У мужчыны павінна быць адказнасць. Як бы ні склаліся стасункі з жонкай, трэба думаць яшчэ і пра агульных дзяцей. Навошта нараджаць, калі потым ты кідаеш іх дзеля іншай жанчыны? Як гэта — дзяліць дзяцей? Нельга быць такім эгаістам... У нас, мне здаецца, ва ўсіх канфліктах заўжды было ўзаемаразуменне і любоў. Нават калі пасварымся, бывае: ну, пакрыўдзіліся адно на аднаго тры дні, потым памірыліся.

Т.С.: — Натуральна, без дробных непаразуменняў сямейнага жыцця не бывае. Але ніколі размовы аб разводзе ў нас не вяліся.

Яны дагэтуль звяртаюцца адно да аднаго ласкавымі імёнамі. І нават заўвагі робяць па-добраму.

Б.В.: — На маёй памяці жонка за ўсё жыццё ніводнага разу не лаялася, ніколі брыдкага слова не сказала. Як я магу побач з ёй сварыцца? Нават калі на дачы што-небудзь раблю і малатком па пальцы траплю, крычу: «Ах, ёлкі... Бора-а!» — з усмешкай распавядае Барыс Васільевіч.

— Часта спрэчкі ў сям'і пачынаюцца зусім з драбязы: скажам, з таго, хто павінен выкінуць смецце. Вы нейкім чынам падзялілі гаспадарчыя клопаты?

Т.С.: — Так, з самага пачатку адбыўся гэты падзел і дагэтуль захоўваецца. Я кватэру не прыбіраю, хіба наводжу чысціню ў ваннай і прыбіральні.

Б.В.: — А я такі акуратыст, крыху чыстаплюй, люблю, каб быў парадак па-мойму. Прасцей жа яго самому навесці, чым патрабаваць ад іншых. Таму прыбіранне на мне, затое гатуе Тома. Праўда, за пліту і сам люблю ўстаць: супы, мясныя стравы — тое, што, як я лічу, гатую лепш за жонку. Хоць яна і не згодна. (*Усміхаецца*).

Святы «ў комплексе»

Б.В.: — А сямейныя святы ідуць у нас комплексна: у красавіку — гадавіна вяселля і дзень нараджэння Алены, а ў ліпені з розніцай у два дні — нашы дні нараджэння. Апошнім часам сустракаем іх на дачы. 70-годдзе Томы, праўда, адзначылі вялікай кампаніяй у рэстаране, а маё 70-годдзе сустрэлі ў тэатры на сцэне, а потым была сяброўская вечарынка.

Т.С.: — Стараемся збірацца ўсе разам на Новы год. Найчасцей — у дачкі і зяця, бо напярэдадні ў Лены вельмі многа работы, а ў першыя дні года можна крыху разняволіцца. Загадзя гатуем некаторыя «фірменныя» стравы — штосьці робіць Бора, штосьці Юра *(Юрый Брэус, другі муж Алены Спірыдовіч.* — **Аўт**.).

Б.В.: — «Мае» стравы — гэта салата з кальмарам і юшка з галавы сёмгі. Ёсць спецыяльны двухлітровы слоік, у які наліваю гэту юшку і прывожу Лене. І, натуральна, калі смажу рыбу, пакідаю галаву. Ніхто так прыгожа і далікатна не есць рыбу, як дачка. Напэўна, гэта ад майго таты перадалося: той таксама вельмі любіў галаву ад фаршыраванай рыбы.

Т.С.: — А мяне яго тата навучыў есці першыя стравы. Я ж дагэтуль вельмі іх не любіла. Адну-дзве лыжкі з ветлівасці з'ем — і адстаўлю талерку. А свёкар спакойна і перакананўча: «Трэба, Тома». Ён наогул гаварыў мала, але шмат чаго рабіў. Памятаю, калі мы з маленькай Ленай прыязджалі да іх пагасціць, ён з раніцы ціхутка зачыняў акаліцы, а потым вывозіў малую ў калясцы і гушкаў, каб даць нам яшчэ крыху паспаць...

— Да дзён нараджэння падарункі выбіраеце загадзя?

Т.С.: — Загадзя, але не так, каб зрабіць сюрпрыз. Наадварот, мы ходзім разам і выбіраем, тое, што спадабаецца.

Б.В.: — Можа, гэта прагматызм нейкі, але я заўжды цікаўлюся: «Тома, што табе патрэбна? Ідзем, купім». Праўда, я хачу, каб яна сабе штосьці выбрала, а яна ўсё мне купляе — сімпатычных маек з «полачкамі» ўжо цэлы стос ляжыць...

— На ваш погляд, што такое шчаслівая сям'я?

Б.В.: — Шчаслівая? Калі ў ёй ёсць любоў. Многія саромеюцца гэтага слова, быццам яно зацяганае. Але яно не збітае, бо любоў — гэта і каханне, і ўзаемапавага, і разуменне. Я не магу пакрыўдзіць жонку, накрычаць на яе: мне будзе сорамна, найперш перад самім сабой. Тое ж і ў ёй адчуваю: калі я на штосьці пакрыўджуся, яна падыходзіць і кажа ласкава: «Бора, Бора...» Магчыма, гэта ўжо больш такія дзіцячыя гульні, чым сапраўдная крыўда, бо мы адно без аднаго не можам. Калі я ад'язджаю на гастролі, Тома бясконца тэлефануе. А калі яна кладзецца ў бальніцу, мне здаецца, што кватэра адразу робіцца вялізнай і пустой.

Т.С.: — Шчаслівая тая сям'я, у якой запамінаеш не цяжкасці, а толькі добрае. Хоць усяго ўсё адно не раскажаш...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва герояў.

■ Фотаздымак з гісторыяй

«У АРГЕНЦІНУ АДПЛЫЎ ЖЫВЫ ТАВАР...»

«Заўсёды, калі праглядваю дзедавы фотаздымкі з сямейнага альбома, успамінаю верш Максіма Танка, — зазначае брастаўчанка Ніна Дрык. — У трыццатыя гады мінулага ўжо стагоддзя многія мужчыны адпраўляліся за мяжу на заробкі. У іх ліку быў мой дзед Васіль Паўлавіч Дрык, 1906 года нараджэння, з вёскі Гірск Кобрынскага раёна. Пакінуўшы на гаспадарцы жонку Маланню, адправіўся ён у Аргенціну. Вось якая атрымалася жыццёвая арыфметыка: майму бацьку было тады няпоўныя два гады, а вярнуўся дзед Васіль праз доўгія 26 гадоў, у 1956-м, і налета ў яго нарадзіўся ўжо ўнук — бацькаў першынец Віталь, мой брат.

...Не надта ласкава прыняла чужая зямля беларускіх эмігрантаў. Але дзякуючы працавітасці, заўзятасці і напорыстай цягавітасці яны зарэкамендавалі сябе з лепшага боку. Не меўшы вялікага выбару, спачатку працавалі на трасняговых плантацыях. Потым гаспадар даў добрую рэкамендацыю — уладкаваліся на суконную фабрыку ў Буэнас-Айрэсе. Заробленыя грошы дзед адкладваў, а начамі яму сніўся родны дом, жонка і сын Сцяпан. Пісьмы былі жывой ніткай сувязі з блізкімі. Дзед Васіль (на фота ён злева) з землякамі марылі аб Радзіме, цікавіліся ўсім, што адбываецца на роднай зямлі, захапіліся ідэямі камунізму і нават... адседзелі па тры месяцы ў турме.

А на радзіме жыццё ішло сваім ходам. Меўся невялікі надзел зямлі, але галадаць не прыходзілася. Баба Малання — і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц — ставіла на ногі сына. Хлопец-бязбацькавіч — рана стаў гаспадаром. Тата ў старэйшых вучыўся цяслярыць, гэблік і стамеска «гарэлі» ў маладых руках. Памалу будаваліся.

Вайна ўнесла свае змены ў сялянскае жыццё. Бабуля пякла хлеб, перадавала партызанам... Потым немцы спалілі хату, але Бог уратаваў жыццё.

Скончылася вайна, будаваліся, як той казаў, з «пяці пальцаў». Заробленыя працадні аплачваліся мізэрна. Выстаялі, загартаваліся ў пекле працоўных будняў і рэдкіх святаў. Бабуля Малання цешылася з гаспадарлівасці сына, а ўночы размаўляла з падушкай. З васьмі мужчын, якія паехалі на заробкі, некаторыя прыжаніліся там, за далёкім светам. Трывожнасць і адзінота сталі бабулінымі сяброўкамі. Незайздросная доля напаткала жанчын-самотніц. Па-рознаму іх называлі ў вёсцы: «удава-амерыканка», а часам і «пакіданка».

А дзеду на чужыне сніўся бярозавы гай за аселіцай і разгалістыя дубы на сядзібе. Жыў адзіным жаданнем: ступіць на родную зямлю, прыціснуць да сябе сына, які вырас без яго. Толькі што чакала «вяртальнікаў» у 1956 годзе ў Савецкім Саюзе? Адэса сустрэла няветліва: поўны ператрус рэчаў, зароблена маёмасці... Не любіў успамінаць дзед гэты момант.

Вярнуўся ён у родную вёску «амерыканцам». Сярод жыхароў вылучаўся: жыццё за мяжой наклала вялікі адбітак. У шафе ў пажаўцелай скрыні і сёння ляжыць дзедаў капялюш з шырокімі палямі (на калектыўным фота дзед — чацвёрты справа — якраз у гэтым капелюшы). Доўга насіў ён і скураную куртку — тужурку. ...Мы, чацвёра унукаў, беглі да дзеда з бабай на хутар, каб зноў і зноў паслухаць «аргенцінскія аповеды» і паразглядваць рэчы, прывезеныя адтуль. Згаладалы па цяплу родных, дзед песціў нас і любіў. Ашчадны па жыцці, рабіў падарункі, якія помняцца дагэтуль: мне, як лепшай у вучобе, падарыў чарнільную ручку ў скураным зялёным футарале. Здавалася, што пісала яна сама.

Любілі яны — а вярнуліся многія — збірацца па святах і ўспамінаць былое. Падтрымлівалі цесныя сувязі, параўноўвалі «гэтае» жыццё з «тым», успаміналі тых, хто застаўся на чужыне. Дзедаў сябар Максім прывёз сюды жонку-іспанку і сына Эміля з надзеяй на добрае жыццё... Нядоўга радаваўся сустрэчы з роднай зямлёй: жонцы не падышоў наш клімат, стала пакутаваць на астму. Пры загадкавых абставінах хутка памёр і сам Максім. Пасля смерці жанчына з сынам «выхадзіла» дазвол вярнуцца ў Аргенціну. Тыя ж «эмігранты», хто застаўся, шмат перанеслі, каб атрымаць пенсію. Некаторыя, як сям'я суседа Пятра Іванавіча Бойкі, атрымалі пацвярджэнне з Міністэрства замежных спраў ужо пасля смерці.

Хутка бяжыць час. Моцныя і трывалыя «парасткі» засталіся ў дзеда Васіля: унук Віталь з жонкай Надзеяй, іх двое дзяцей і трое ўнукаў; унучка Надзея з мужам Сцяпанам, ад іх — двое дзяцей і чацвёра ўнукаў; я (Ніна) і мая дачка з мужам і ўнукам; Таццяна з мужам Анатолем і іх дзеці — тры дачушкі, зяці і двое ўнукаў. Цяпер разглядваем фотаздымкі сямейнага архіва са сваімі ўнукамі. Свята беражом памяць, у якой гісторыя краіны знітавалася з лёсам блізкіх людзей».

❍❍❍

Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на рэдакцыйную пошту альбо электронную скрыню info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.

Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

■ Увага!

Гераіні — маці герояў

Шаноўныя чытачы! Напярэдадні 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Сямейная газета» пачынае збіраць — з мэтай далейшай публікацыі — гісторыі пра маці, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны страцілі на фронце траіх і больш дзяцей. Калі ў вас ёсць дакументальныя сведчанні, фотаздымкі або проста ўспаміны (занатаваныя ці не) па гэтай тэме — дасылайце іх, калі ласка, на адрас рэдакцыі. На падставе гэтых публікацый (калі іх назбіраецца дастатковая колькасць) у будучыні пры ўдзеле журналістаў і пісьменнікаў Выдавецкі дом «Звязда» плануе выданне асобнай кнігі.

Будзем удзячны ўсім, хто адгукнецца!

ЗНАКІ НА ЎДАЧУ

У традыцыйнай культуры славян па падабенстве розных з'яў і акалічнасцяў, якія спадарожнічалі нараджэнню чалавека, меркавалі аб тым, як складзецца яго лёс.

1. Так, калі ў адзін дзень у сям'і хтосьці паміраў (праходзіла пахаванне) і нараджалася дзіця, то гэтае супадзенне ўспрымалася як прадказанне недаўгавечнасці нованароджанага. Парадзіце трэба было абавязкова раніцай і ўвечары на працягу дзевяці дзён пасля хаўтур чытаць малітву Багародзіцы і разнастайныя словы-абярэгі. І наадварот, калі пры нараджэнні немаўляці ў хаце пражываў доўгажыхар, то жыццё ў дзіцяці, як лічылі, будзе вельмі шчаслівым і доўгім.

2. Шчаслівым лічылася і тое дзіця, у дзень нараджэння якога ў сям'і быў яшчэ які-небудзь прыбытак, напрыклад, ацялілася карова, ажарабілася кабыла, апарасілася свіння, адбылася загадзя запланаваная вялікая купля і да т.п.

3. Самым надзейным знакам шчасця, паводле народных паданняў, была так званая «дзіцячая кашуля» — фрагменты жывой тканкі ў выглядзе тоненькай плёнкі, якія маглі застацца на галаве або целе дзіцяці. Яе акуратна здымалі, сушылі і захоўвалі як талісман, які прыносіць поспех.

4. Лічылася, што дзіця, якое нарадзілася з дастаткова доўгімі валасамі, будзе багатым і шчаслівым.

5. Нягоды абяцалі дзіцяці, калі яно з'яўлялася на свет уніз тварам, наперад нагамі або спавітае вакол шыі пупавінай. Лічылася, што ўсё жыццё чалавек будзе раздзіраць гэтыя нябачныя путы, якія будуць ускладняць пошук свайго месца пад сонцам (у сям'і, у вучобе, на працы). Калі пупавінай была абкручаная дзяўчынка, то чытаюць малітвы і замовы-абярэгі ў жаночы дзень (серада, пятніца, субота), калі хлопчык — у мужчынскі дзень (панядзелак, аўторак, чацвер).

6. Лічылася, што дзеці, народжаныя ў буру, будуць заўсёды ствараць вакол сябе перадумовы «буры» ва ўзаемаадносінах з людзьмі і ў штодзённых паводзінах: яны будуць крыклівыя, нявытрыманыя, непаслухмяныя і, як вынік, нешчаслівыя. Таму народныя лекары раілі падмешваць святую ваду пасля Вадохрышча ў ночвы пры купанні.

7. Калі дзяўчынка, падрастаючы, станавілася падобнай да бацькі, а сын — да маці, гэта лічылася добрым знакам шчаслівага і ўдалага жыцця. Калі ж сын быў падобны да бацькі, а дачка да маці, баяліся, што такія дзеці не створаць сваёй сям'і.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

■ Пясочніца

Дзяленне і адніманне

3-гадовая Марынка з дзелавым выглядам раздае з бацькам рознакаляровыя паперкі — дзіцячыя «грошы»:

— Гэта тату, гэта маме...

— Дзякуй, Марынка. Якая ты добрая дзяўчынка!

— Я ў вас потым усё назад забяру, калі вы спаць будзеце.

Вуснамі дзіцяці...

5-гадовай Ані відавочна сумна гуляць адной, а бацькі занятыя. Прыткнуўшыся то да аднаго, то да другога з просьбамі пачытаць, намаляваць снегавіка ці паглядзець, як яна здорава круціць абруч, малая становіцца пасярэдзіне пакоя і патэтычна ўздымае рукі:

— Як, ну як вы можаце называцца маімі бацькамі, калі вас зусім не цікавіць, чым я жыву?!

Пачатковая матэматыка

У Дзімы з мамай дамова: спачатку абед, потым гульні і забавы. Але на гэты раз 4-гадовы малы панура калупаецца ў талерцы і ўсё ніяк не можа даесці.

— Ну які можа быць мультык, калі ў цябе сіл нават на тэфтэльку не хапае? — абураецца мама. Дзіма жвава пхае ў рот адразу дзве:

— А цяпер я пагляджу два мультыкі, так?

❍❍❍

Мама, пачытай!

Цюцька наш
разумны самы:
Як пачуе голас мамы,
Стане ціхім
і ласкавым —
Не цікуе за катом.
А як толькі рыпне
брама,
За якою знікне мама,
Тут жа кот яму цікавы,
І ў доме —
ўсё ўверх дном.

Сяргей МАХНАЧ,
г. Мінск.

5 ФІЛЬМАЎ для сямейнага прагляду:

Канстанцін ЮМАНАЎ, вядучы радыё «Мір»:

1. «Цягнік на Юму». Фільм рэжысёра Джэймса Мэнгалда з'яўляецца сапраўднай гісторыяй бацькоўства, якая ілюструецца падзеямі на Дзікім Захадзе. У гэтай карціне паказаны гераізм і самаахвяраванне дзеля бацькоўскай любові, сяброўства. Толькі яны здольныя ператварыць холад і няпраўду ў любоў.

2. «Лепшая прапанова». Карціна, знятая Джузэпэ Тарнаторэ, пра тое, што хлусня і цынізм сваёй прысутнасцю ў нашым жыцці прымушаюць змяняць свае прыярытэты і пераглядаць каштоўнасці не на сваю карысць. Аднак усё змяняецца, калі вам адказваюць узаемнасцю на вашы ўчынкі. Вельмі прыгожая і павучальная гісторыя пра бег часу, няпраўду і адасобленасць у жыцці.

3. «Рэальныя вепры». Гэта гісторыя пра сяброўства і прыгоды. Тут вас чакаюць моцныя духам героі, якія маюць уяўленне пра братэрства, узаемадапамогу і ведаюць, што ў жыцці здольнае натхняць.

4. «Гадкі Я». Мультфільм, які расказвае пра цудоўнае пераўтварэнне дрэннага ў добрае, калі ў змаганні ваша зброя — гэта любоў.

5. «Смурфікі». Сямейны камедыйны фільм, гісторыя пра тое, што ў кожнага з нас ёсць сваё месца ў жыцці. І пры жаданні кожны можа стаць героем. Таксама паказвае прыклад сяброўства і адзінства, калі адзін за ўсіх і ўсе за аднаго.

У народзе кажуць: «УСЯГО ЗА ГРОШЫ КУПІШ, АПРОЧ БАЦЬКІ І МАТКІ».

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

БЕЛАРУСБАНК

ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

«Восемьдесят первого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 09 апреля 2014 года в г. Минске.

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк»:

Номера счетов	Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада	Номера счетов	Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада
А035	112 (Сто двенадцать)	А552	112 (Сто двенадцать)
А076	112 (Сто двенадцать)	А572	450 (Четыреста пятьдесят)
А100	225 (Двести двадцать пять)	А628	450 (Четыреста пятьдесят)
А149	112 (Сто двенадцать)	А673	112 (Сто двенадцать)
А194	112 (Сто двенадцать)	А695	112 (Сто двенадцать)
А233	112 (Сто двенадцать)	А728	112 (Сто двенадцать)
А255	112 (Сто двенадцать)	А781	112 (Сто двенадцать)
А295	112 (Сто двенадцать)	А836	112 (Сто двенадцать)
А332	112 (Сто двенадцать)	А853	112 (Сто двенадцать)
А378	112 (Сто двенадцать)	А901	112 (Сто двенадцать)
А401	112 (Сто двенадцать)	А925	225 (Двести двадцать пять)
А479	112 (Сто двенадцать)	А980	900 (Девятьсот)
А498	112 (Сто двенадцать)	-	

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т. е. за №№ А035, А1035, А2035 и т. д.

Председатель комиссии: Ольга Владимировна Провоторова — Начальник отдела торговли и услуг Администрации Первомайского района г. Минска

Ответственный секретарь: Татьяна Александровна Ясинская — Заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Круглую печать Потребительского кооператива «Автостоянка «КОМБИ» **считать недействительной** с 6 апреля 2014 года в связи с утерей. УНП 100166517

Считать недействительным страховой полис филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН2РП серия БМ № 0642689. УНП 100706519

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ РАЗМЕЩЕНИЯ ОБЪЕКТОВ РОЗНИЧНОЙ ТОРГОВЛИ В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Местоположение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения	Условие проведения аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер	Инженерная и транспортная инфраструктура
1.	Бобруйский район, д. Ломы, перед въездом на кладбище «Ломы»	227 265	22 727	10 241 518 (расходы возмещает победитель аукциона)	Наличие не менее двух участников	Площадь 0,0100 га	№ 720881204101000100	Имеется: подключение к электроснабжению, асфальтированная подъездная дорога, централизованное водоснабжение

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится 28.04.2014 года в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 62, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-го дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений – 22.04.2014 года до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске 71 74 83.

1. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка на расчетный счет финансового отдела Бобруйского райисполкома р/с 3604000000929 в филиале 703 АСБ «Беларусбанк», код 760, УНП 700003308, назначение платежа 04002.

Кроме того, представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

2. Срок аренды земельных участков – 25 лет.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Заместитель председателя Бобруйского райисполкома И.Н. Кисель

ААТ «Вілейскі райаграсэрвіс» —

СВЯТА ЎРАДЖАЮ — КРУГЛЫ ГОД!

Раённыя аграсэрвісы — хуткая дапамога для сельскагаспадарчых арганізацый. Ужо шмат гадоў гэтая ганаровая місія ляжыць на плячах калектыву ААТ «Вілейскі райаграсэрвіс», якое было створана ў 2003 годзе і налічвае 170 чалавек. Прафесіяналізм, творчая ініцыятыва, вялікая самааддача кожнага працаўніка забяспечваюць эфектыўную і прадукцыйную работу на ўсіх узроўнях вытворчасці.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА!

ААТ «Вілейскі райаграсэрвіс»
222410,
Мінская вобласць,
горад Вілейка,
вул. 1 Мая, 105.
Тэл. дыр. (01771) 3 53 08,
прыёмн./факс 3 51 51.

УНП 600010756

НАШЫ МАГЧЫМАСЦІ:

✓ **РАМАНТУЕМ І АБСЛУГОЎВАЕМ ТЭХНІКУ:**
- трактары МТЗ 80/82, 1221, 1523S
- кпп трактароў МТЗ 80/82, 1221
- збожжаўборачныя і льноўборачныя камбайны
- рухавікі Д-240
- бароны БДТ
- сеялкі
- дызельную паліўную апаратуру

✓ **ЗАБЯСПЕЧВАЕМ ГАСПАДАРКІ ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА:**
мінеральнымі ўгнаеннямі і сродкамі аховы раслін запаснымі часткамі, вузламі і агрэгатамі АПК гаруча-змазачнымі матэрыяламі

✓ **РАЗВІВАЕМ СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ, ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ**

✓ **АКАЗВАЕМ ТРАНСПАРТНЫЯ ПАСЛУГІ**

НА ВЯЛІКДЗЕНЬ БУДЗЕ ТАК...

Якім вы ўяўляеце сабе галоўнае вясновае свята? З такім пытаннем я звярнуўся да навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. Кедышкі. Хоць жыццёвы вопыт маіх юных суразмоўцаў яшчэ небагаты, высветлілася, што ўсе яны выдатна ведаюць, як дарослыя рыхтуюцца і сустракаюць Вялікдзень.

Калекцыю па-велікоднаму ўпрыгожаных яек прадстаўляе будучая мастачка Іна Кавалеўская.

Таня Рамановіч (будучы мастак-афарміцель): «Мая бабуля Вольга да свята фарбуе яйкі ў адвары шалупіння цыбулі. У нас таксама робяць іх рознакаляровымі з дапамогай набытых у краме спецыяльных набораў фарбы. Зразумела, кожны імкнецца ўпрыгожыць яйкі адпаведным малюнкам... А на свята ўсе ідуць у царкву. У маёй роднай вёсцы Моталь на Вялікдзень царква асабліва прыгожая».

Інга Шаўчэнка (будучы мастак-настаўнік): «Мы заўжды гатуем да свята кулічы — духмяныя, смачныя, прыгожа аздобленыя. Я ўжо сама навучылася іх выпякаць па нашым сямейным рэцэпце. Перадсвяточны настрой спрыяе маім вучэбным справам — у гэтыя дні я завяршаю дыпломную работу, якую назвала «Беларуская мадонна».

Будучая мастачка-настаўніца Інга Шаўчэнка і яе дыпломная праца «Беларуская мадонна».

Па беласнежных аблоках пад брамай палявых кветак крочыць жанчына з немаўлём — такой уяўляе сабе маладая мастачка абагульнены партрэт мадонны ў беларускіх нябёсах. На велікодным тыдні ў каледжы запланавана чарговае пасяджэнне дыпломнай камісіі, якая разам з творамі іншых навучэнцаў будзе ацэньваць работу Інгі Шаўчэнкі. Варта пажадаць поспехаў усім, і асабліва тым мастакам-пачаткоўцам, хто выбраў багатую і складаную тэму нашай духоўнасці.

Дарэчы, кожны, хто прыходзіць у каледж, заўважае, што інтэр'еры вучэбных кабінетаў, майстэрань, бібліятэкі, прасторных калідораў насычаны дызайнерскімі знаходкамі, якія зноў і зноў вяртаюць да думак пра духоўную спадчыну. Гэта выявы старажытных храмаў і палацаў на сценах, размешчаныя на паліцах і стэндах унікальныя вырабы побытавага ўжытку з саломкі і лазы, мастацкі роспіс, інкрустацыя, кераміка... Большасць з гэтага зроблена навучэнцамі, асобамі творчымі і неабыякавымі.

— Гэта выдатна, калі ў любой справе прысутнічае элемент творчасці, — пракаментавала ўбачанае мной у каледжы яго дырэктар Гана Бойка. — У нашай установе прафтэхадукацыі прафесію атрымліваюць не толькі майстры мастацкага роспісу, дызайнеры інтэр'ераў, керамісты. Мы рыхтуем таксама кваліфікаваных мулярaў, тынкоўшчыкаў, цесляроў-бетоншчыкаў, мантажнікаў, абліцоўшчыкаў, мастаўшчыкоў, дарожных рабочых — гэтую моладзь заўжды чакаюць у мінскіх будаўнічых арганізацыях ААТ «МАПІД». Маюцца выдатныя аўдыторыі для заняткаў, інтэрнат побач з вучэбным корпусам, спартыўная і трэнажорная залы, медкабінет, сталовая. На базе каледжа праводзяцца сімпозіумы і навукова-практычныя канферэнцыі, майстар-класы, выставы.

Дзевяноста гадоў таму мінская школа фабрычна-заводскага навучання № 5 прыняла сваіх першых курсантаў — так у той час называлі ахвотнікаў атрымаць рабочыя прафесіі. З непрыкметнай маленькай школы вырас сённяшні каледж — установа шырока вядомая, якая адпавядае сучаснаму ўзроўню. Вірлівае жыццё штодзень патрабуе ад каледжа большага, новага, і ён не адстае, навучае ўчарашніх школьнікаў рабочым прафесіям, якія неабходны сёння. Фундаментам гэтаму служыць багатая прафесійная і педагагічная традыцыя, а таксама ўсведамленне таго, што кожную справу ўмацоўваюць творчыя і духоўныя каштоўнасці.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

У бібліятэцы каледжа шмат выданняў на тэму культуры і гісторыі Беларусі. Тут фотааб'ектыў «убачыў» навучэнцаў Серафіма Рудчанку і Дзяніса Зікеева.

РРБ-Банк

Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»

220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18

www.rrb.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	На 01.04.2014	На 01.04.2013
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	59952,3	44 545,3
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	434586,9	411 599,0
5	Средства в банках	1104	22198,6	11 882,4
6	Ценные бумаги	1105	-	15 125,5
7	Кредиты клиентам	1106	496605,7	393 505,7
8	Производные финансовые активы	1107	149297,1	122 073,6
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	106115,2	26 184,2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	7989,5	5 434,7
12	Прочие активы	1111	13303,4	8 997,7
13	ИТОГО активы	11	1290048,7	1 039 348,1
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	111097,3	109 769,7
16	Средства банков	1202	40710,8	71 658,2
17	Средства клиентов	1203	881073,3	673 561,5
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	1756,6	31 473,9
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	12 570,5
20	Прочие обязательства	1206	8795,9	5 707,3
21	ВСЕГО обязательства	120	1043433,9	904 741,1
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	182696,0	55 768,7
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	5570,0	3 520,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	20087,1	17 379,6
27	Накопленная прибыль	1215	38261,7	57 938,2
28	ВСЕГО капитал	121	246614,8	134 607,0
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	1290048,7	1 039 348,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.04.2014	на 01.04.2013
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	43538,6	26712,3
2	Процентные расходы	2012	23817,7	19328,2
3	Чистые процентные доходы	201	19720,9	7384,1
4	Комиссионные доходы	2021	13741,7	15870,4
5	Комиссионные расходы	2022	858,9	719,3
6	Чистые комиссионные доходы	202	12882,8	15151,1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	(13,4)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(4144,8)	2166,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	6329,5	(88,5)
11	Чистые отчисления в резервы	207	2906,4	3575,5
12	Прочие доходы	208	2431,5	1754,5
13	Операционные расходы	209	19937,6	15765,2
14	Прочие расходы	210	930,0	1706,3
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	13445,9	5307,0
16	Налог на прибыль	212	2501,6	949,3
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	10944,3	4357,7
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях			
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		

И.о. Председателя Правления Н.К.Юркевич

Главный бухгалтер Т.И.Карчмит

Дата подписания «09» апреля 2014 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 21 от 07.06.2013. УНП 100361187

■ Экслібрыс «Звязды»

У ДАДАТАК ДА ПАДРУЧНІКАЎ

Пагадзіцеся, зацікаўленаму вучобай у цэлым ці нейкім асобным прадметам школьніку заўсёды недастаткова звестак, якія прадстаўлены на старонках школьнага падручніка. І нават калі прачытаць усё, што напісана дробным шрыфтам ці рашыць усе задачкі з «зорачкамі», прага да новых ведаў застанецца. Цікава ж! Інтэрнэт тут наўрад ці здольны выратаваць вучня: непадрыхтаванаму чытачу і даследчыку, яму прасцей заблукаць сярод мноства старонак з інфармацыяй рознага кшталту, чым знайсці сапраўды карысныя тэксты. Вядома, бацькі могуць дапамагчы, зарыентаваць, а настаўнікі — параіць вартыя ўвагі рэсурсы. Але ёсць больш простае выйсце — новая серыя «Кніжная паліца школьніка» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі». У яе межах і пабачыла свет кніга «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі».

Вельмі шкада, што я ў дзяцінстве не мела такой кнігі. У нашай сельскай бібліятэцы былі толькі «Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі», а ў школьнай — славутая «Памяць пра легенды» Кастуся Тарасава ды першыя гістарычныя раманы Уладзіміра Арлова. Чытаць пра гісторыю хацелася, таму і даводзілася фактычна «прадзіраца» праз складаную мову гэтых выданняў. Але ці патрэбны школьнікам настолькі цяжкія тэксты? Нават гістарычныя раманы не заўсёды лёгка ўспрыняць непадрыхтаванаму чытачу, тым больш, калі гэта пяці- ці шасцікласнік, які толькі пачынае знаёмства з гісторыяй роднага краю. Больш за тое, чытанне падобных кніг павінна прыносіць задавальненне, а не выклікаць дадатковыя складанасці.



Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі: для мал. і сярэд. шк. узросту / склад. І. Б. Клепікаў. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. — 278 с.

Іншая справа — выданне, пра якое мы вядзём гаворку. Аўтарамі тэкстаў, што ўвайшлі ў кнігу, з'яўляюцца вядомыя даследчыкі мінуўшчыны, пісьменнікі і публіцысты Уладзімір Бутрамееў, Алесь Марціновіч, Ірына Масляніцына і Мікола Багадзяж. Да таго ж яны самі выгадавалі ці гадуюць дзетак, таму дакладна ведаюць, як зацікавіць маленькіх гісторыкаў слаўнымі постацямі, нечаканымі паваротамі сюжэта ці знакавымі падзеямі. Яны ўмеюць ператварыць гіпотэзу ў цікавы аповед, а легенду ці паданне расказаць так, што аж дух захоплівае. Яны ведаюць, як трымаць напружанне і ўтрымліваць увагу чытача да самага канца.

Думаецца, кнігай будуць задаволены і бацькі маленькіх разумнікаў. Гісторыі, прадстаўленыя ў выданні «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі», досыць кароткія, але вельмі змястоўныя, з дакладным лінейным сюжэтам. Таму іх можна чытаць (ці распавядаць), як казкі, і дашкольнікам, і малодшым школьнікам, якія яшчэ не могуць самастойна прачытаць тэксты. Да гэтых апавяданняў можна звяртацца разам: бацькам і дзецям, бабулям-дзядулям і ўнукам, старэйшым і малодшым братам-сёстрам. Чытаць, пераказваць, успамінаць, абмяркоўваць, шукаць працяг расповеду ці ілюстрацыі, партрэты герояў у тым жа інтэрнэце. Балазе, колькасць знакавых асоб і аб'ём кнігі дазваляюць ператварыць гэты занятак у добрую сямейную традыцыю.

Дарэчы, звернемся да зместу выдання і тых славутых постацяў, якім прысвечаны асобныя тэксты. Натуральна, у ліку герояў ёсць ключавыя фігуры, без якіх у нашай гісторыі ніяк не абысціся: Усяслаў Чарадзей, Рагвалод, Рагнеда, Францыск Скарына, Гедымін і Альгерд, Сімяон Полацкі, Давыд Гарадзенскі... Расповеды пра іх, хутчэй, стануць дадаткам да школьных урокаў гісторыі, дапамогуць паўтарыць ужо вывучаны матэрыял. Але ёсць у кнізе і звесткі пра не менш значных, але не такіх знакамітых культурных і дзяржаўных дзеячаў. Да прыкладу, мала хто ведае імя князя Андрэя Полацкага, сына Альгерда, які некаторы час княжыў у Полацку і Пскове; нямногія прыгадаюць, чаму Багуслава Радзівіла можна назваць «Слуцкім д'Артаньянам», і адзінкі дакладна назавуць імя і таленты дачкі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Не варта палохацца таго, што некаторым асобам у гэтай кнізе прысвечана не адна, а некалькі гісторый. Так, пра Настассю Слуцкую, Рагвалода, Рагнеду, Усяслава Чарадзея аўтары згадваюць неаднойчы. Гэта, хутчэй, станоўчы бок выдання. Своеабліывыя паўторы сюжэтаў, прадстаўленыя рознымі аўтарамі, дапамогуць праверыць памяць, засяродзіць увагу маленькага чытача, змогуць садзейнічаць развіццю ўмення супастаўлення, знаходжання падобных момантаў і адрозненняў праз параўнанне некалькіх тэкстаў. Магчыма, менавіта гэтая кніга падштурхне школьнікаў да больш падрабязнага самастойнага вывучэння новай і новай гістарычнай літаратуры.

Прыемнага самастойнага і сямейнага чытання! Цікавага падарожжа ў слаўнае беларускае мінулае!

Марына ВЕСЯЛУХА

■ Гаспадарскі клопат

СТВАРАЕМ ПАДМУРАК ДЛЯ ЗДАРОВАГА ЎРАДЖАЮ

Нарэшце дачнікі дачакаліся чарговага сезону. Як правільна прывесці свой зямельны ўчастак у гатовы для пасеваў стан? З якімі праблемамі можна сутыкнуцца пры правядзенні «генеральнай прыборкі» і ці можна іх вырашыць, не наносячы шкоды наваколлю і ўласнаму здароўю? Пра гэта распавялі спецыялісты Цэнтра экалагічных рашэнняў (ЦЭР), таварыства «Зялёная сетка» і ўстановы «АграЭкаКультура».

Калодзежы — на праверку

Большасць дачнікаў упэўнена — вада са свайго ўчастка апрыёры не можа быць шкоднай. Але статыстыка сведчыць: самая забруджаная вада выяўлена менавіта ў сельскіх калодзежах, якія сілкуюцца грунтовымі водамі. Адбываецца гэта ў асноўным з-за парушэння тэхналогіі будавання шахтных калодзежаў. Вада ў іх вельмі часта забруджваецца нітратамі — якія тояць у сабе вялікую небяспеку для здароўя. Трапляючы з вадой у страўнік, нітраты ператвараюцца ў таксічныя нітрыты. Яны прыводзяць да гіпаксіі (кіслароднага галадання) і анеміі, таксама могуць выклікаць рак. Піць забруджаную нітратамі ваду, есці прыгатаваную на ёй ежу — сапраўдная рызыка, асабліва для малых дзяцей і хворых на гастрыт і дыспепсію. «Даныя праверкі паказалі, што ў 25% проб з прыватных калодзежаў маюць перавышэнне нормы па нітратах у два разы,— кажа **Наталля ПАРЭЧЫНА, спецыяліст па ўстойлівым кіраванні воднымі рэсурсамі ЦЭР.**— Хоць дапушчальная канцэнтрацыя складае 4 міліграмы на літр, лепей, каб іх зусім не было». Праверыць калодзежную ваду можна самастойна, звярнуўшыся ў ЦЭР па праверачныя палоскі — паслуга бясплатная. Другі варыянт: запрасіць спецыялістаў з мясцовай санстанцыі, працэдура каштуе ад 20 да 50 тысяч рублёў. Праверку лепей праводзіць у кожны сезон года, бо колькасць нітратаў будзе мяняцца ў залежнасці ад змены надвор'я.

Спецыяліст раіць: зрабіце вакол калодзежа «замок» з ушчыльненай гліны на глыбіню два метры і такую ж шырыню.

Агонь не ўсё «прымае»

Вясенняя генеральная прыборка на ўчастку часам нагадвае маслянічнае вогнішча — спальваем усё лішняе, што трапляе пад руку. У ход ідуць старая мэбля, папера, гума, пластык, сінтэтыка — самыя распаўсюджаныя забруджвальнікі паветра. Узгадаем нашых продкаў — яны абагаўлялі агонь і не кідалі туды абы што. Той жа пластык трапляючы ў агонь, выдзяляе таксічныя рэчывы. Афарбаванае дрэва і старыя газеты маюць у сваім саставе свінец, а гумавыя пакрышкі змяшчаюць канцэрагены. Тэмпературы агню недастаткова для поўнага згарання гэтых матэрыялаў, частка незгарэлых адходаў застаецца ў попеле. У вогнішчы на дачы варта спальваць арганіку: напрыклад, хворыя рэшткі раслін. Для астатніх рэчаў існуе сметніца і спецыялізаваныя пункты прыёму таго ж пластыку, паперы, старых рэчаў.

Градкі па правілах прыроды

Сухое расліннае «смецце», сабранае на ўчастку, можна скарыстаць для стварэння ўгнаення — кампосту. Інгрэдыентамі выступяць попел ад спаленых раслін, кухонныя адходы і гной. Добры кампост змяшчае ў сабе ўсе неабходныя мікраэлементы, і ў такім выпадку на ўчастку можна абысціся без «хіміі». Напрыклад, у попеле бацвіння таматаў ёсць усе неабходныя мікраэлементы для вырошчвання гэтай культуры.

«Дасканалая чысціня вашым градкам не патрэбна. Сухія рэшткі галінак, раслін, травы можна выкарыстоўваць для мульчыравання — то бок, прыроднымі «адходамі» можна закрываць глебу для яе захавання і паляпшэння»,— тлумачыць **Вольга ШЧАГЛІНСКАЯ, спецыяліст па арганічнай сельскай гаспадарцы ўстановы «АграЭкаКультура».** Перакопваць зямлю не трэба, бо карысныя мікраарганізмы выходзяць на паверхню і гінуць, а глеба становіцца безабароннай. Перакопванне патрэбна толькі пры зборы ўраджаю.

Агледзьце кусты парэчкі — частым госцем на яе пупышках бываюць кляшчы. Хворыя пупышкі неабходна зрэзаць і спаліць. Абрэзку дрэў праводзьце акуратна і без азарту — выразаючы паламаныя галінкі і тыя, што загушчаюць крону. Дачакаўшыся цёплага надвор'я, можна прымяняць біяпрэпараты для барацьбы з насякомымі-шкоднікамі, якія прачынаюцца пры цёплай тэмпературы да 12 градусаў на працягу 10 дзён.

Ці ёсць альтэрнатыва хіміі?

Пестыцыды вельмі папулярныя сярод беларускіх дачнікаў. Але мала хто з іх сапраўды цікавіцца, наколькі гэты сродак падыходзіць для градак. «Набываюць звычайна па 3–5 прэпаратаў і, асабліва не разбіраючыся, прымяняюць разам. Эфект ад падобных сумесяў бывае неверагодна шкодны,— каментуе Вольга Шчаглінская.— Прадукцыя ад прысядзібных гаспадарак, вырашчаная на «хіміі», займае да 97%. Мы думаем, што набываем здаровую агародніну, але памыляемся». Лёгкі спосаб пазбавіцца ад насякомых-шкоднікаў — набыць хімічную атруту, размяшаць у вядры і апрацаваць градкі. Атрымліваецца, дачнікі ляпаюцца падумаць пра прычыну — чаму тут з'явілася гэтае насякомае? У прыродзе на любую істоту ёсць свой спажывец, гэта харчовы ланцужок, які чалавек перарывае, вынішчаючы «шкоднікаў». На іх месца прыходзяць іншыя. А варта ўсяго толькі падумаць — што я раблю на сваім участку не так?

Замест пестыцыдаў можна выкарыстоўваць біяпрэпараты, заказваць іх у спецыялізаваных крамах — такога тавару на нашых прылаўках амаль няма, бо мала хто цікавіцца альтэрнатыўнымі сродкамі. І абавязкова прыслухайцеся да прыроды! Участак можна зрабіць па яе правілах. «Стварыце мясціны для гнездавання птушак — у ціхім куточку саду,— раіць Вольга.— Накідайце кучы галля, дзе зможа пасяліцца вожык. Земляныя жабы знойдуць прытулак у вільготных мясцінах. Восенню трэба пайсці на здаровы лужок, сабраць насенне і пасеяць на ўчастку прыроднае разнатраўе. Тады ваша дача акрыяе і ператворыцца ў здаровую экасістэму».

Кацярына РАДЗЮК

■

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

СУНІЦЫ НА МАГНІТАХ

У рэдакцыю даслаў ліст Пётр Вільямовіч з Маладзечна, у якім расказаў пра свой незвычайны і вельмі цікавы эксперымент.

«Аднойчы мне трапілася цікавая інфармацыя пра тое, што расліны станоўча рэагуюць на магнітнае поле. Захацелася праверыць гэта на ўласным вопыце.

Свой першы эксперымент правёў з ляснымі суніцамі.

Для доследаў з магнітамі выкарыстаў некалькі вельмі слабых кусцікаў суніц, якія знайшоў недалёка — на чыгуначным адхоне. Блізкасць чыгункі пайшла разеткам суніц відавочна не на карысць — выгляд у іх быў вельмі прыгнечаны. Я выкапаў 8 чэзлых кусцікаў і пасадзіў іх на адлегласці 30 см адзін ад аднаго, выкарыстаўшы круглыя магніты ад дынамікаў. Ніякіх угнаенняў пры пасадцы і далейшым вырошчванні гэтых разетак я не ўносіў. Саджанцы суніц добра прыжыліся, падужэлі і прыкметна крануліся ў рост. Вясной наступнага года ў кожнай з гэтых разетак суніц з'явілася вялікая колькасць кветканосаў (для параўнання: у лясных суніц звычайна ўтвараецца на кусціку не больш за два кветканосы).

Пасля дружнага цвіцення завязаліся і пачалі хутка павялічвацца ў памерах шматлікія ягады. Пад іх цяжарам кветканосы нахіляліся да зямлі. Каб зберагчы ягады ад шэрай гнілі, побач з кожным кусцікам я паставіў апоры ў выглядзе кольцаў з ацынкаванага дроту. У пачатку ліпеня сабраў з кусцікаў суніц першы ўраджай — 115 буйных спелых, надзвычай салодкіх і духмяных ягад. Аказалася, што кожная з іх важыла больш за 1 грам! За два тыдні я сабраў са сваёй «магнітнай» сунічнай плантацыі 1120 цудоўных ягад агульнай вагой 805 г — і гэта ўсяго з 8 кусцікаў!

Магчыма, калі б я адабраў для гэтага эксперымента ў лесе лепшыя кусцікі суніц з буйнымі ягадамі, то атрыманы ад іх пры дапамозе магнітаў ураджай быў бы больш значным…

Адпладаносіўшы, кусцікі неўзабаве далі вялікую колькасць даччыных разетак, ад якіх налета я зноў атрымаў добры ўраджай.

Я думаю, каб стабільна атрымліваць высокія ўраджаі лясных суніц, пажадана кожны год высаджваць на магніты новыя маладыя расліны. Можна браць і свае ўкаранёныя разеткі.

Наступны эксперымент я правёў на старой маліне (гэтым пасадкам было ўжо больш за 10 гадоў). Магніты таксама далі вельмі добры вынік.

На гэты раз я размясціў магніты толькі каля металічных апор драцяной шпалеры, да якой мацаваліся парасткі маліны. У выніку — кусты старой маліны далі магутныя парасткі і выдатна адпладаносілі буйнымі ягадамі.

Паказальна тое, што ў іншых месцах саду ўраджай паўнавартасных кустоў звычайнай маліны аказаўся нашмат горшым, а іх ягады былі драбнейшымі, чым у старой маліны з ужываннем магнітаў».

Механізм уздзеяння магнітнага поля, які выклікае лепшае развіццё і плоданашэнне раслін, пакуль да канца не высветлены. Цалкам магчыма, што магніты канцэнтруюць вакол каранёў раслін іоны растворaных у вадзе соляў, якія раней былі недаступныя раслінам.

ПАСЕЕМ МОРКВУ ПРАВІЛЬНА

Насенне морквы пачынае прарастаць пры тэмпературы глебы 4–5 °С. Пры такой тэмпературы перыяд прарастання доўжыцца да 20 дзён, пры тэмпературы 15–20 °С ён скарачаецца да 8–10 дзён. Аптымальная тэмпература для вырошчвання морквы — 20–25 °С.

Каб паскорыць прарастанне і атрымаць дружныя ўсходы, насенне замочваюць і трымаюць у вільготным стане да таго часу, пакуль яно не ўзыдзе. Сеюць моркву ў апошнія дні красавіка — у пачатку мая. Глыбіня пасеву — 1–2 см.

Варта памятаць, што морква — культура, якая доўга прарастае, таму разам з ёй высейваюць насенне маячных культур (салату, радыску, кальрабі), якія прарастаюць значна хутчэй. Гэта дае магчымасць раней пачаць догляд пасеваў (барацьба з пустазеллем, рыхленне). Адлегласць паміж радамі — 25 см, паміж раслінамі пасля праралджвання — 3–6 см. Не варта пазніцца з праралджваннем, інакш прыгнятаецца рост раслін, фарміруюцца дробныя і дэфармаваныя караняплоды. Аднак пры занадта рэдкім пасеве караняплоды грубеюць і таксама дэфармуюцца.

Лепшымі глебамі для морквы лічацца лёгкія супяшчаныя і суглінкавыя з нейтральнай рэакцыяй. Падбіраюць такое месца, якое добра асвятляецца на працягу ўсяго дня. Пры недахопе святла расліны морквы выцягваюцца. З гэтай жа прычыны лічыцца недапушчальнай і загушчанасць пасеваў.

Самыя спрыяльныя папярэднікі для морквы — ранняя бульба, тамат, цыбуля, агурок і капуста.

Морква вельмі патрабавальная да вільгаці. Пры яе недахопе фарміруюцца дравяністыя, дробныя караняплоды, часта няправільнай формы. Аднак пры лішку вільгаці бацвінне моцна разрастаецца, а караняплоды трэскаюцца.

Ужываючы ўгнаенні, зыходзяць з таго, што для морквы найбольшая колькасць азоту патрабуецца ў першай палове вегетацыйнага перыяду, калію — у другой (пры ўтварэнні караняплода); фосфар прыблізна аднолькава выкарыстоўваецца на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду. Акрамя таго, моркве патрабуецца шмат кальцыю. Кіслыя глебы пад яе пасевы трэба абавязкова вапнаваць.

Морква добра адклікаецца на попел, унесены ў глебу перад пасевам (100–150 г на 1 м²). Таксама эфектыўна ўнясенне аміячнай салетры (20 г/м²), суперфасфату і хлорыстага калію (па 30 г/м²) у сумесі з торфам і перагноем. А вось свежы гной пад моркву прымяняць не варта: ён пагаршае таварныя якасці караняплодаў.

Пасля з'яўлення 2–3 сапраўдных лістоў расліны падкормліваюць растворам птушынага памёту (1:10) або гнаявой жыжкі (1:5). На глебах з недахопам азоту праводзяць дзве падкормкі мачавінай: першую — пасля з'яўлення ўсходаў (2 г/м²), другую — пры ўтварэнні 4–5 лістоў (4 г/м²). Апошнюю падкормку даюць у сухім выглядзе пасля канчатковага праралджвання раслін: суперфасфат (5 г на 1 м²) і хлорысты калій (2–3 г на 1 м²). Уносіць іх лепш у баразёнкі на адлегласці 10 см ад радка.

Дзеля росквіту роднай краіны

Ад імя ўсіх хлебаробаў СВК, вясковай інтэлігенцыі ад шчырага сэрца віншую старшыню Пінскага раённага выканаўчага камітэта **Валерыя Васільевіча РЭБКАЎЦА** з 50-годдзем з дня нараджэння. Працуючы на гэтай адказнай пасадзе, Вы, шаноўны Валерый Васільевіч, шмат зрабілі для сацыяльна-эканамічнага развіцця нашага раёна. Зычым і ў будучыні сумесна з працоўнымі калектывамі палескай глыбінкі гэтак жа ініцыятыўна, энергічна і сумленна рабіць сваю высакародную справу дзеля далейшага росквіту Рэспублікі Беларусь, шчасця і дабрабыту кожнай сям'і.

**З павагай,
Сяргей Мікалаевіч САЗАНЧУК,
старшыня праўлення СВК «Ласіцк» Пінскага раёна.**

УНП 200079866.

Разам з нашымі хлебаробамі віншую **Валерыя Васільевіча РЭБКАЎЦА** з 50-годдзем. Зычу, каб наш Пінскі раён пад Вашым вопытным кіраўніцтвам заставаўся адным з лепшых у палескім краі. Шчасця Вам і вашай сям'і, упэўненасці ў кожным кроку да новых працоўных перамог, даўгалецця.

**З павагай,
Сяргей Уладзіміравіч КРЫЛЬЧУК,
старшыня праўлення СВК «Лапаціна» Пінскага раёна.**

УНП 200110692.

Старшыні Пінскага райвыканкама **Валерыю Васільевічу РЭБКАЎЦУ**

Юбілей святкуе Рэбкавец,
Не проста юбілей, а залаты:
Араты, сейбіт ён і жнец —
Заўжды з задорам маладым.

Яшчэ і мудры кіраўнік
З павагай шчырай да людзей...
Няхай Вам кожны красавік
Да шчасця сонцам
шлях кладзе.

**Аляксандр АНДРЫЕВІЧ,
старшыня Пінскага райаграпрамсаюза.**

УНП 201016437.

БелВЭБ

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	5.1	455 489.1	412 171.2
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	5.2	12 547.5	9 531.0
4	Средства в Национальном банке	1103	5.3	829 080.5	1 079 737.2
5	Средства в банках	1104	5.4	1 418 200.1	1 800 681.0
6	Ценные бумаги	1105	5.5	2 218 308.8	1 458 115.7
7	Кредиты клиентам	1106	5.6	14 033 042.3	11 363 365.3
8	Производные финансовые активы	1107	5.7	38.3	158.1
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	5.8	29 785.9	29 785.9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	5.9	1 098 935.1	739 452.5
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	5.10	5 044.9	0.9
12	Прочие активы	1111	5.11	247 775.1	196 377.3
13	**ИТОГО активы**	**11**		**20 348 247.6**	**17 089 376.1**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201	5.12	250 077.1	311 495.2
16	Средства банков	1202	5.13	10 177 835.1	8 270 411.1
17	Средства клиентов	1203	5.14	6 579 446.8	5 494 186.4
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	5.15	18 224.8	332 433.5
19	Производные финансовые обязательства	1205	5.16	45.0	655.2
20	Прочие обязательства	1206	5.17	340 063.0	248 597.7
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**17 365 691.8**	**14 657 779.1**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211	5.18	1 174 075.0	1 174 075.0
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213	5.18	286 856.9	245 426.6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	5.18	596 499.9	480 427.3
27	Накопленная прибыль	1215	5.18	925 124.0	531 668.1
28	ВСЕГО капитал	121		2 982 555.8	2 431 597.0
29	ИТОГО обязательства и капитал	12		20 348 247.6	17 089 376.1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011	6.1	2 026 069.9	1 551 258.9
2	Процентные расходы	2012	6.1	1 083 506.2	834 905.0
3	Чистые процентные доходы	201	6.1	942 563.7	716 353.9
4	Комиссионные доходы	2021	6.2	521 131.4	338 514.0
5	Комиссионные расходы	2022	6.2	145 196.2	91 241.9
6	Чистые комиссионные доходы	202	6.2	375 935.2	247 272.1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	6.3	(344.8)	534.8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	6.4	23 836.1	177.3
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	6.5	57 268. 5	132 626.3
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	6.6	(19 710.4)	(73 106.1)
11	Чистые отчисления в резервы	207	6.7	221 344.6	120 242.2
12	Прочие доходы	208	6.8	59 777.0	81 312.7
13	Операционные расходы	209	6.9	596 039.0	453 029.9
14	Прочие расходы	210	6.10	114 534.2	82 218.0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		507 407.5	449 680.9
16	Налог на прибыль	212		93 104.8	62 249.3
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		414 302.7	387 431.6
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		35	36
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		35	36

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала					
			Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль (убыток)	Фонды переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Раздел I. За год, предшествующий отчетному								
1	Остаток на 1 января 2012 года	3011	758 464.0	-	65 078.3	324 584.9	328 808.4	1 476 935.6
1.1	В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок	30111						
2	Изменение статей капитала	3012	415 611.0	-	180 348.3	207 083.2	151 618.9	954 661.4
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	387 431.6	151 618.8	539 050.4
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	180 348.4	(180 348.4)	x	-
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	415 611.0	-	x	x	x	415 611.0
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	415 611.0	-	x	x	x	415 611.0
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	-	x	-
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	x	x	x	x	-
2.7	перераспределение между статьями капитала	30125	-	-	-	-	-	-
2.8	прочие изменения	30126	-	-	(0.1)		0.1	-
